КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №16 (144)
◂ 8 МАЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ГАЛАДОЎКА ЯК АРГУМЕНТ У БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЦЫ**

Стар. 6

**УСЁ ПАД КАНТРОЛЕМ**

«Сітуацыя ў эканоміцы Беларусі складаная, але ўсё пад кантролем», — заявіў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка.

Стар. 5

**ДРУГІ БОК ЭПІДЭМІІ**

Гісторыю чалавецтва нельга разглядаць асобна ад гісторыі хваробаў...

Стар. 11

**УЛАДЗІСЛАЎ ДРЭМА. БЕЛАРУСКІ СЛЕД ЛІТОЎСКАГА МАСТАКА**

**ЛІТАРАТУРА НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Нарыс Марыі Мартысевіч**

**Андрэй Кім**

**З цыклу «Новая генерацыя»**

ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ



# ЗДЫМАК-СІМВАЛ

Аляксей ХАДЫКА

**Хрэстаматыйны здымак з выявамі савецкіх салдатаў, якія ўсталёўваюць сцяг Перамогі на карнізе Рэйхстагу на фоне заваяванага Берліна ў маі 1945 года, добра вядомы ва ўсім свеце, а на постсавецкай прасторы — ці не кожнаму.**

Шмат хто прыгадае імёны сцяганосцаў, сяржантаў, Герояў Савецкага Саюза Міхаіла Ягорава і Мелітона Кантарыі. Такая ўжо роля вобразаў і знакаў-сімвалаў, увасобленых выразнымі сродкамі розных відаў мастацтва. Напрыклад, загаварыўшы пра асваенне Луны — адразу прыгадваем кадры высадкі на яе паверхню амерыканскіх астранаўтаў або савецкі лунаход. Як вобразны знак ЗША — непазбежна ўсплыве ў свядомасці статуя Свабоды. Перанясемся ў думках у Японію — і ўяўляем сабе абрысы гары Фудзіяма, апетай у традыцыйных японскіх жывапісе і графіцы.

Сёння, напярэдадні Дня Перамогі, дарэчы звярнуцца да знакамітых фотаздымкаў карэспандэнта ТАСС Яўгена Халдзея. Яны — вобраз-сімвал, у якім рэальныя падзеі выступаюць асновай сюжэта. Гісторыя іх стварэння, асабліва ў апошнія гады, не з'яўляецца таямніцай. Аўтар здымкаў прыгадваў, што адбывалася 2 мая 1945 года, праз пяўтары дні пасля рашучага штурму Рэйхстага: «Нас там было чацвёра, але я добра памятаю кіяўляніна Аляксея Кавалёва, які прывязваў сцяг. Я доўга яго фатаграфаваў у розных позах. Памятаю, што мы ўсе тады добра змерзлі... Нам дапамагалі старшына Абдулхакім Ісмаілаў з Дагестану і мінчук Леанід Горычаў».

Бачым, не абышлося без нашых землякоў, а шчаслівўчыкамі выпала стаць ваярам з бліжэйшай часткі, разведроты 82-й гвардзейскай стралковай дывізіі. А дзе ж Ягораў і Кантарыя? Як мяркуюць гісторыкі, з пачатку штурму будынку ўвечары 30 красавіка, калі невялікія групы савецкіх салдат прабіваліся ў яго пад агнём фашыстаў, у розных яго частках было змешчана да 40 вялікіх і малых сцягоў: проста кавалкі чырвонай тканіны, часам прымацаваныя да тронка рыдлёўкі ці адламанай аканіцы. Настолькі моцным было жаданне паставіць кропку ў ненавіснай вайне.

Толькі каля 3-й гадзіны ночы 1 мая Ягораў з Кантарыем і зампаліт батальёна 150-й дывізіі лейтэнант Аляксей Берасt усталявалі афіцыйны «сцяг № 5» — адзін з дзевяці, загадзя падрыхтаваных камандаваннем 3-й арміі 1-га Беларускага фронту для дзевяці дывізій, што штурмавалі цэнтральныя раёны нямецкай сталіцы. Яго і замацавалі ля коннай скульптуры Вільгельма I на ўсходнім фасадзе Рэйхстага.

Таму Ягораў, Кантарыя і Берасt не былі першымі, хто ўвайшоў у Рэйхстаг са сцягам. Сфатаграфаваць іх, як і першых сцяганосцаў, у тлуме і гвалце змагання ў ноч з 30 красавіка на 1 мая было немагчыма. Але пастановачны здымак, зроблены Халдзеем 2 мая з іншымі, таксама рэальнымі ўдзельнікамі штурму, дасканала перадаў агульнае і значнае, выказанае знакамітымі словамі Аляксандра Твардоўскага:

*Бой идет святой и правый,*
*Смертный бой не ради славы —*
*Ради жизни на земле…*

Праўда мастацкага здымка супала з праўдай гістарычнага моманту.

Калі вам выпадзе трапіць у Рэйхстаг наведвальнікам-госцем, як гэта красавіцкімі днямі 2009 года адбылося з групай беларускіх журналістаў, запрошаных фондам імя першага канцлера пасляваеннай Заходняй Германіі Конрада Адэнаўэра, вас напэўна многае здзівіць. Асабліва востра гістарычны кантэксты чытаюцца ў юбілейным 2009 годзе — калі ФРГ спаўняецца 60 год, а падзенню сцяны, што падзяляла савецкі і заходнія сектары Берліна, — 20.

«Жыццё на зямлі», здабытае савецкімі салдатамі, адбудоўвалася ў раз'яднанай Германіі па-рознаму. У ФРГ ужо ў 1953 годзе быў адноўлены ўзровень даваеннага дабрабыту, колькасць насельніцтва да часу аб'яднання краіны вырасла з 40 да 60 мільёнаў. ГДР атрымала іншыя дасягненні. Самы высокі ўзровень насычанасці грамадства службоўцамі «Штазі», міністэрства дзяржбяспекі — 1 на 150 грамадзян (нават у СССР 1 супрацоўнік КДБ прыпадаў на 597 жыхароў). І скарачэнне ўласнага насельніцтва за 40 год існавання з 18 да 16 мільёнаў, нягледзячы на жалезную заслону і Берлінскую сцяну.

Германія пасля 9 мая 1945 года атрымала два ўрокі, цвёрда засвоеныя грамадствам. Прышчэпку супраць фашызму. Таму ў Рэйхстагу, які з 1999 года стаў наноў месцам пасяджэнняў Бундэстагу, парламенту аб'яднанай Германіі, экскурсавод пакажа гасцям надпісы, пакінутыя салдатамі пераможнай Савецкай Арміі.

Сведчанні часу, урокі гісторыі, немцы імкнуцца захаваць, каб не паўтараць трагічныя памылкі мінулага. Насуперак логіці забыцця — надпісы, поўныя драматызму, радасці, гневу, розных пачуццяў, што ўздымаліся ў сэрцах воінаў у майскія дні 1945 года, — зберагаюцца як сродак абароны супраць вяртання ў таталітарнае мінулае. Магчыма, для вас спецыяльна звярнуць увагу на радкі: «Тут быў беларус Ванькевіч». І распавядуць гісторыю, як ужо ў 1990-я гады супрацоўнікі сучаснага Рэйхстагу, якія вывучаюць яго гісторыю, адшукалі і запрасілі ў Берлін пскавіча Міхаіла Мініна — таго, хто першым увечары 30 красавіка 1945 года ўвайшоў у будынак і замацаваў пераможны сцяг над парадным фасадам Рэйхстагу на кароне алегарычнай скульптуры «Германія».

Таму не дзіва, што ўсе савецкія мемарыялы — і знакаміты Воін-вызваліцель у Трэптаў-парку, і помнікі палеглым салдатам у Цігарцене і Шонхольцэр-Хайдзе — дагледжаны і шануюцца, адрэстаўраваны і прыведзены ва ўзорны парадак. Немцы засвоілі ўрок недаравальнасці ідэй нацыяналістычнага рэваншу, з якімі Германія распаліла другую сусветную вайну.

Але ёсць і іншы ўрок — недапушчальнасці таталітарызму, адваротнага боку фашысцкага медаля, урок, які немцы засвоілі цягам драматычных 45 год паваеннай гісторыі, падзелу і ўз'яднання краіны, досведам рознага жыцця — стваральнага адраджэння ў ФРГ і таталітарнага падпарадкавання асобы дзяржаўнай машыне ў ГДР.

Гэта другая частка ўрокаў свабоды і гуманізму, атрыманых і засвоеных немцамі пасля вайны. Ці можа гэты змест быць прачытаны і намі, нашчадкамі «краіны-пераможцы», пры поглядзе на знакаміты здымак Яўгена Халдзея? Ці можам мы адчуць, што падзенне фашызму было трыумфам чалавечнасці над дыктатурай і прыгнётам? Пэўна, так, але давядзецца прызнаць, што да шляху ўсталявання дэмакратыі і грамадзянскай свабоды, як да аднаго з магчымых вынікаў другой сусветнай вайны, мы можам звярнуцца толькі праз дзесяцігоддзі па яе завяршэнні. І толькі пры ўмове агульнанацыянальнага засваення таго другога ўроку, які скарыстала пераможаная Германія. Прышчэпкі супраць кожнай формы таталітарызму.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЛЕЙКА. ЗНІШЧЫЛІ ПОМНІК РАСЦІСЛАВУ ЛАПІЦКАМУ

Помнік антысавецкаму падпольшчыку, змагару за незалежнасць Беларусі быў усталяваны вілейскай грамадскасцю ўвосень 2008 года ва ўрочышчы Красны Беражок, на месцы расстрэлу героя. Помнік быў асвечаны праваслаўным святаром з вёскі Касута, адкуль родам сам Лапіцкі, і дзе яго бацька таксама быў праваслаўным святаром. Асаблівая цынічнасць злачынства ў тым, што здзейснілі яго напярэдадні Радаўніцы.

Каб знішчыць помнік, выкарыстоўвалася магутная тэхніка — вялікі трактар з каўшом, самазвал. Сам помнік уяўляў сабой камень, на якім выгравіраваны надпіс: "У гэтым месцы расстраляны Расціслаў Лапіцкі (I.IX.1928–28.X.1950). Змагар за незалежнасць Беларусі». Помнік быў усталяваны на бетонную падушку, меў вагу ў некалькі тон, камень злучаны з бетонам металічнымі прутамі. Разбурыць такі помнік няпроста. Відавочна, зрабіць гэта маглі толькі людзі, у чыіх руках сканцэнтравана дастаткова ўлады.

### АСТРАВЕЦ. ТАВАРЫСТВУ АХОВЫ ПОМНІКАЎ НЕ ДАЗВОЛІЛІ СУСТРЭЦЦА З ГРАМАДСКАСЦЮ

Улады раёна не дазволілі правесці сустрэчу з грамадскасцю прадстаўнікам Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Намеснік старшыні райвыканкама Віктар Свіла матываваў адмову тым, што «ў бліжэйшыя месяцы ў раёне запланавана шмат розных масавых мерапрыемстваў».

Старшыня таварыства Антон Астаповіч паведаміў, што 26 сакавіка ён звярнуўся ў райвыканкам з прапановай арганізаваць у красавіку ў гарадскім пасёлку сустрэчу актывістаў грамадскага аб'яднання з мясцовымі краязнаўцамі. Па яговых словах, сустрэча запланавана «ў мэтах зберажэння і памнажэння нацыянальнага духоўнага і культурнага здабытку, гістарычнай спадчыны і прыродных багаццяў краіны, выхавання моладзі ў духу любові да Радзімы» і адпавядае ўказу прэзідэнта № 710 ад 29 снежня 2008 года «Аб абвяшчэнні 2009 года Годам роднай зямлі». Падчас сустрэч меркаваліся выступы Антона Астаповіча і загадчыка аддзелам Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Зміцера Яцкевіча па праблемах захавання і інтэрпрэтацыі гісторыка-культурных каштоўнасцяў раёна, а таксама па пытаннях вывучэння архіўных крыніц гісторыі гэтага краю. Акрамя таго, планавалася правесці прэзентацыі дакументальнага фільма «Палякі», створанага актывістамі таварыства на студыі «Брэндстар», і адной з тэлеперадачаў серыі «Падарожжы дылетанта», прысвечанай гістарычным месцам раёна, з выступам акцёра і тэлевядучага Юрыя Жыгамонта.

### АШМЯНЫ. УВЕКАВЕЧЫЛІ ПЕРШАГА АЗЕРБАЙДЖАНСКАГА ЛЁТЧЫКА

Ля вёскі Баруны быў устаноўлены памятны знак у гонар загінулага падчас Першай сусветнай вайны экіпажа самалёта «Ілля Мурамец» № 16. На адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі амбасады Азербайджана ў Беларусі, беларускія дыпламаты, прадстаўнікі Міністэрства абароны, грамадскасць. Такім чынам быў ушанаваны першы лётчык гэтай краіны.

Фарук Гаібаў быў адзін з чатырох членаў экіпажа самалёта «Ілля Мурамец». Паходзіў ён з сям'і юнкера эскадрона Яго Імператарскай Вялікасці. Рана застаўся без бацькі. Навучаўся ў пецярбургскім Канстанцінаўскім вучылішчы. Вызначаўся храбрасцю. У званні афіцэра быў пасланы на заходні фронт. У яго абавязкі ўваходзіла бамбаванне, стральба з кулямёта, фатаграфаванне з паветра пазіцый праціўніка. У першы вылет экіпаж разбурыў мост праз Нёман, за што немцы распачалі паляванне за самалётам. Перад тым, як загінуць 12 верасня 1916 года, экіпаж знішчыў некалькі нямецкіх самалётаў. Гаібава і другіх членаў экіпажа немцы пахавалі з належным воінскім шанаваннем. Аўтары памятнага знака — беларускі скульптар Калесніснкі і архітэктар Буры.

### МАСТЫ. ЛЮДЗЕЙ ПАЧУЛІ, КАЛІ ЯНЫ АБ'ЯДНАЛІСЯ

Адбылася сустрэча прадстаўнікоў Руху "За Свабоду" і кіраўніцтва Мастоўшчыны з жыхарамі Чыгуначнага раёна горада.

У мерапрыемстве ўзяло ўдзел каля 100 чалавек. На сустрэчы прысутнічаў старшыня райвыканкама Аляксей Шафарэвіч, рэгіянальны каардынатар Руху "За Свабоду" ў Гродзенскай вобласці Алесь Зарэмбюк, намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама па пытаннях будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь Снітко і дэпутат Мастоўскага райсавета ад чыгуначнай выбарчай акругі Віктар Шкляр. Людзей цікавіла вырашэнне пытанняў газіфікацыі, пагаршэнне эканамічнай сітуацыі непасрэдна ў горадзе, змяншэнне на палову заробкаў на асноўных прадпрыемствах, адсутнасць у мікрараёне лазні, праблема малога асартыменту і колькасці прадуктаў харчавання ў мясцовай краме ды іншае. Прадстаўнікі мясцовай улады не далі канкрэтных адказаў на пастаўленыя людзьмі пытанні, але ж паабяцалі працягнуць працу над іх вырашэннем.

Напярэднічаў сустрэчы калектыўны зварот грамадзян, што арганізавалі прадстаўнікі руху. Сярод іншых у звароце былі патрабаванні вырашыць праблемы рамонту дарог і асвятлення. Пад гэтым зваротам падпісалася 230 жыхароў.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

ЗМАГАННЕ

# БЕЗЗАКОННЕ НЕАБХОДНА СПЫНЯЦЬ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Праваабаронца з Астраўца Іван Крук паўстаў супраць незаконнага расходавання грашовых сродкаў, якія плацяць грамадзяне ў ЖКГ за капітальны рамонт.**

Амаль два гады таму гараджане звярнуліся да праваабаронцы з просьбай даведацца, куды ідуць грошы, якія яны штомесяц плацяць на капітальны рамонт. Бо калі дому неабходны капітальны рамонт, то кіраўніцтва ЖКГ адказвае: «Няма сродкаў».

З гэтай нагоды Іван Крук склаў адкрыты ліст і даслаў старшыні Савета міністраў РБ, старшыні Дзяржкантролю РБ, у Канстытуцыйны суд, Міністэрства ЖКГ, у сродкі масавай інфармацыі. У звароце былі выкладзены ўсе праблемы капітальнага рамонту будынкаў мястэчка (а яны характэрны ўсёй Беларусі). Пад зваротам паставілі подпісы больш за паўсотні гараджан.

Міністэрства ЖКГ накіравала запыт у Гродзенскае абласное ЖКГ. Савет Міністраў — у Міністэрства ЖКГ. Толькі адзін Канстытуцыйны суд адказаў так: «Норма адлічэння на капітальны рамонт да 1999 года была абавязковая, бо існаваў цяжкі фінансавы стан у краіне. Мясцовая ўлада магла скарыстаць сродкі як заўгодна, але з 2001 года яны павінны выкарыстоўвацца па прызначэнні і нікуды болей». Камітэт дзяржкантролю вярнуў зварот у райвыканкам.

Рэакцыя райвыканкама была імгненнай. Падпісантаў сталі запалохваць і патрабаваць адклікаць подпісы. Але заяўляльнікі атрымалі лісты за подпісам старшыні райвыканкама Адама Кавалькі, у якім пацвярджаецца, што частка грошай грамадзян на капітальны рамонт пайшла не па прызначэнні, а на добраўпарадкаванне.

Пасля гэтага Іван Крук напісаў скаргу на імя генеральнага пракурора РБ і міністра МУС. Чаму ў МУС? Ён, як ганаровы работнік праваахоўных органаў, ведае, што ў гэтай структуры існуе падраздзяленне па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Зноў Генпракуратура і Міністэрства ўнутраных спраў скаргу адправілі на «ніз».

А мясцовая ўлада блакавала запыты міністэрства і пракуратуры.

Іван Крук напісаў скаргу ў Камітэт дзяржаўнага кантролю на імя яго старшыні Зянона Ломаця і міністру МУС Навумаву. У скарзе былі прыведзены факты нямэтавага выкарыстання сродкаў, сплачаных грамадзянамі на міфічны капрамонт. Толькі пасля гэтага Астравецкі ЖКГ сталі правяраць. Гродзенскае аддзяленне Камітэта дзяржкантролю і кантралёры дакументальна ўстанавілі, што гэтыя грошы траціліся не па назначэнні.

Іван Крук настроены рашуча: «У гэтым пытанні я пайду далей, бо норма не законная, паколькі грошы ідуць не па прызначэнні. Дзіўная сітуацыя: людзі не могуць сабе купіць хлеба, а павінны плаціць. Напачатку будзе скарга ў Гродзенскі абласны суд, затым — у Вярхоўны. Несумненна, па гэтым пытанні пойдзе зварот у Палату прадстаўнікоў».

---

З НАГОДЫ

# ГЛУМЛЕННЕ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Штогод у Дзень Перамогі наступае пік выхаваўча-патрыятычнай работы. Беларускія піянеры ля помнікаў загінулым нясуць ганаровую варту, чыноўнікі перад прымусова запрошанымі на свята грамадзянамі і побач з апошнім ветэранам кажуць прамовы. Толькі бываюць выпадкі, калі ўсе ўдзельнікі свята топчуць нагамі магілы тых, хто ў імя перамогі ахвяраваў сваё жыццё.**



Прыкладаў таму шмат, але самы яскравы — у Мастах Гродзенскай вобласці. Жахлівае руйнаванне брацкіх магілаў паспяхова завершана, і ў Дзень Перамогі тут адбудуцца святочныя ўрачыстасці.

Напрыканцы 1940-х у Мастах паўстала брацкая магіла, куды былі перазахаваны 855 ахвяраў вайны. Над ёй у гонар палеглых быў пастаўлены помнік, які мастаўчане і па сённяшні дзень называюць помнікам Жукаву, у гонар Героя Савецкага Саюза старшага сяржанта Васіля Жукава, які загінуў на Мастоўшчыне. Пахаванне абгарадзілі.

Але пры чарговай рэканструкцыі цэнтра горада помнік перанеслі на 50 метраў ад магілы і павярнулі фасадам у другі бок. На месцы пахавання паўстаў газон, і сведчання таго, што тут пахаваны загінулыя вызваленцы, не засталося. Ля самога помніка былі пакладзены мемарыяльныя пліты з прозвішчамі крыху больш за 200 пахаваных.

І вось летам 2008 года распачалася рэканструкцыя вул. Савецкай. Ужо восенню газоны былі зруйнаваны. Пахаванне сталі прасаваць бульдозеры. З наступленнем зімы праца спынілася, і ў такім стане (гл. здымак) яно заставалася да вясны. Работы па яго добраўпарадкаванню аднавіліся два месяцы таму. Па брацкай магіле прайшоў ходнік.

У Дзень Перамогі, стоячы на гэтым ходніку, грамадскасць будзе шанаваць палеглых, што аддалі сваё жыццё за наша сённяшняе мірнае.

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# САМІТ ТРЭЦЯГА СЕКТАРУ

**5–6 мая ў Празе напярэдадні саміту «Усходняга партнёрства» прайшоў форум недзяржаўных арганізацый краін-партнёраў — Арменіі, Азербайджану, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны.**

Якую ролю можа і павінна адыгрываць незалежнае грамадства краінаў Еўрасаюза і постсавецкіх краін у ініцыятыве «Усходняе партнёрства»? Гэту праблему на працягу двух дзён абмяркоўвалі дзесяткі прадстаўнікоў недзяржаўных арганізацый, палітыкаў і экспертаў.

Хіба не ўпершыню адбылася такая прадстаўнічая сустрэча актывістаў незалежнага грамадства з постсавецкіх краін з іх калегамі з аб'яднанай Еўропы. Беларусь на форуме прадстаўлялі грамадскія дзеячы, дасведчыкі і праваабаронцы Алесь Бяляцкі, Алесь Лагвінец, Віталь Сіліцкі, Ірына Віданава і Ігар Леднік.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, кіраўнік чэшскага МЗС Карэл Шварцэнберг сказаў: «Увесь эксперымент «Усходняга партнёрства» будзе пустой абалонкай, калі ён застанецца толькі дамовай паміж урадамі, якія змяняюцца. Але калі мы хочам стварыць сапраўднае «Усходняе партнёрства», тады ваша супрацоўніцтва будзе важнейшае за ўсё іншае».

Цікава адзначыць, што рабочыя групы форуму паводле зместу супадалі з тэматычнымі «платформамі», на якіх мяркуецца наладзіць супрацоўніцтва ў межах «Усходняга партнёрства» паміж дзяржавамі, — гэта «Дэмакратыя і каштоўнасці», «Эканамічная канвергенцыя з Еўрасаюзам», «Энергетычная бяспека» і «Кантакты паміж людзьмі».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЛЕПШ ПРАЦАВАЦЬ, ЧЫМ СВЯТКАВАЦЬ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Вось і скончыліся працяглыя майскія святы. Народ адпачыў, пасадзіў бульбу, з'ездзіў на шашлыкі... Зараз па гарадах і вёсках ходзяць людзі з загарэлымі тварамі, бо надвор'е спрыяла. Але камусьці працяглыя святы відавочна на карысць не пайшлі.**



Photo.ByMedia.Net

Прыкладам таго, як не трэба адпачываць, можа служыць доктар гістарычных навук, член Геральдычнай рады пры прэзідэнце Беларусі Сяргей Рассадзін. На прэс-канферэнцыі «Развіццё беларускай геральдыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Вытокі беларускай сімволікі», ён заявіў, што рамбічны арнамент, які прысутнічае на дзяржаўным сцягу Беларусі, існаваў яшчэ 12 тысяч гадоў таму, калі на зямлі жылі маманты. Паводле яго слоў, арнамент яскрава бачны пры зрэзе біўня маманта Mammutus primi genius.

«Арнамент мае глыбокую гісторыю, яго элементы прасочваюцца нават у культуры цывілізацыі Цэнтральнай Азіі і Кітая. Некаторыя кажуць пра ісламскае прачытанне нашага сцяга, але гэта не так. Мы павінны належным чынам ставіцца да сваёй гісторыі, — падкрэсліў Рассадзін.

Сенсацыйная заява пра тое, што беларусы з'яўляюцца прамымі нашчадкамі мамантаў, уражвае. Але добра і тое, што паходзім ад мамантаў, а не ад знакамітай вавёркі. То бок «белачкі» — дэлірыюм трэменс.

Лепш бы спадар Рассадзін браў прыклад з беларускага прэзідэнта. Аляксандр Рыгоравіч нават у выходныя напружана працаваў над паляпшэннем іміджу Беларусі. На тыдні ён даў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Рэйтэр», дзе заявіў, што Беларусь гатова да лібералізацыі пры ўмове, што рэформы не дэстабілізуюць эканамічную і палітычную сітуацыю ў краіне.

Закрануў Лукашэнка і такую слізкую тэму, як пытанне пра прызнанне грузінскіх Абхазіі і Паўднёвай Асеціі: «Расія пераконвае Мінск узяць іх за прыклад і прызнаць іх незалежнасць, тады як ЕС не раз казаў, што гэта пашкодзіць кантактам Беларусі з Захадам. Мне хочацца вырашыць яго так, каб не было негатыву ў нашых людзей, каб людзі ўспрынялі дзеянні ўлады як свядомыя, прадуманыя і ўзважаныя», — цытуе прэзідэнта «Рэйтэр».

Ускосна гэта значыць тое, што прызнанне незалежнасці гэтых рэгіёнаў будзе вырашацца залежна ад таго, што прапануе Беларусі Расія і Еўрапейскі Саюз. У залежнасці ад таго, хто заплаціць больш, і будзе вырашацца гэта пытанне.

І тым не менш, А. Лукашэнка вырашыў не ехаць у Прагу. Беларускую дэлегацыю на ўстаноўчым саміце палітыкі «Усходняе партнёрства» Еўрасаюза, які пройдзе 7 мая ў Празе, узначаліць першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. У склад афіцыйнай дэлегацыі таксама ўключаны міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў.

Такое рашэнне прыняў сам А. Лукашэнка, «зыходзячы са спецыфікі новай палітыкі». Паколькі яе змест «цалкам прыкладны і ахоплівае сацыяльна і эканамічна значныя кірункі супрацоўніцтва (гандаль, энергетыка, транспарт, міграцыя і г.д.), яе курыраванне аднесена да кампетэнцыі ўрада».

Карацей, для прысутнасці Аляксандра Лукашэнкі ў Празе «Усходняе партнёрства» — занадта «дробны бісер». Не прэзідэнцкая гэта справа — вырашаць «прыкладныя пытанні». Вось з'ездзіць на Лоеўскі камбінат будаўнічых матэрыялаў, альбо ў Салігорск для адкрыцця пятага калійнага камбінату — самае тое.

А пакуль нашы навукоўцы выводзяць беларускі род ад мамантаў, а палітыкі вырашаюць глабальныя пытанні, сусветны эканамічны крызіс дабраўся да самага святога. Напярэдадні 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў рэгіёнах Вечныя агні пераводзяць на антыкрызісны рэжым працы.

У Камянцы каля брацкай магілы савецкіх воінаў не гарыць Вечны агонь. Бо, па словах начальніка аддзела ідэалагічнай працы Камянецкага райвыканкама Ірыны Нігерыш, падчас эканамічнага крызісу трэба лічыць капейку. «Ён у нас гарыць у святочныя дні, у нас жа не Брэсцкая крэпасць... А калі ў нас праходзяць святы (23 лютага, дзень вызвалення, дзень горада), мы абавязваем «Гаргаз», і яны падключаюць. Але цэлы дзень ён у нас, вядома, не гарыць... У эканамічны крызіс кожны лічыць капейку...»

На мемарыяльных комплексах зараз усталёўваюць газавыя лічыльнікі. Па словах начальніка аддзела жыллёвакамунальнай гаспадаркі Гомельскага гарвыканкама Сяргея Кадола, улады выконваюць рашэнне ўрада: «Існуюць з нядаўняга часу правілы ўліку прыроднага газу, якія зацверджаны на ўзроўні ўрада ў канцы 2008 года. Правілы прадугледжваюць наяўнасць прыбораў уліку газу там, дзе ёсць яго спажыванне».

Вечны агонь у Брэсцкай крэпасці абыходзіцца штомесяц у 5 тысяч долараў. Раней яго ўтрыманне забяспечваў «Газпрам». Аднак сёлета, па словах дырэктара комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Валерыя Губарэнкі, падобная дамова пакуль не падпісана. «Газпрам» скончыў усе плацяжы ў гэтым годзе. А на наступны год дамовы з ім няма. За газ плаціць Рэспубліка Беларусь з бюджэту.

У Беларусі шмат Вечных агнёў, якія ўключаюцца толькі на святы. Але ёсць, ёсць магчымасць запаліць іх ізноў! Ізноў жа, за кошт эканоміі дзяржаўных сродкаў. 5 мая Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Як адзначаецца ў паведамленні прэс-службы прэзідэнта, амністыя «не будзе насіць шырокі характар». Традыцыйна вызваляюцца ад крымінальнай адказнасці льготныя катэгорыі асоб, што ўчынілі злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, і менш цяжкія злачынствы. Амністыі падлягаюць таксама асобы, асуджаныя за менш цяжкія злачынствы — пры адбыцці не менш адной чвэрці тэрміну пакарання; за асобныя цяжкія эканамічныя злачынствы — пры адбыцці не менш адной трэціны тэрміну пакарання. Вызвалены таксама будуць асобы, што ўчынілі любое злачынства, калі да заканчэння тэрміну адбывання пакарання засталося менш за год.

Як заявіў у ПП НС выканаўца абавязкаў міністра ўнутраных спраў Анатоль Куляшоў, у выніку амністыі будзе вызвалена каля 4,5 тысячы чалавек, маркуемая эканомія сродкаў рэспубліканскага бюджэту складзе 2 мільярда рублёў.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АНДРЭЙ МЕЗІН

Ад 24 красавіка ў Швейцарыі праходзіць 73-ці чэмпіянат свету па хакеі з шайбай. Каманда нашай краіны бярэ ўдзел у матчах элітнага дывізіёну. Напярэдадні чвэрцьфіналу з расійскай зборнай (чэмпіёнамі свету) варатар хакейнай зборнай Беларусі Андрэй Мезін парадаваў аптымістычным настроем беларускіх заўзятараў сваімі выказваннямі ў інтэрв'ю газеце «Прессбол». «Чамусьці нехта лічыць, што мы задаволімся месцам у васьмёрцы. Гэта ўжо было, час выходзіць у паўфінал. Па-першае, трэба стрымаць прагназуемы напор расіян у дэбюце. Калі гэта атрымаецца, у другім перыядзе амаль дакладна з'явяцца шанцы забіць і ў іх вароты. Тады, можна не сумнявацца, яны пабягуць «выратоўваць Расію», пачнуць цягаць шайбы па адзіночцы. І тут — глеба для развіцця нашага поспеху. Мне не прызвычайвацца выцягваць па паўсотні кідкоў за матч. Галоўнае, каб не ўсе былі з забойных пазіцый. Разлічым перад Расіяй беларускае балота. А калі трэба будзе, і падпалім яго…» — папярэдзіў расійскіх хакеістаў Андрэй Мезін. Аднак не атрымалася. Зборная Беларусі прайграла.



### СЯРГЕЙ РАССАДЗІН

Прыхільнікам новых тэорый, відавочна, не магло не спадабацца «адкрыццё» доктара гістарычных навук, члена Геральдычнага савета пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргея Рассадзіна. На прэс-канферэнцыі «Развіццё беларускай геральдыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Вытокі беларускай сімволікі» доктар гістарычных навук падзяліўся з журналістамі сенсацыйным фактам: аказваецца, арнаменту на цяперашнім дзяржаўным сцягу мы абавязаныя мамантам. Паводле слоў навукоўца, у рамбічным элеменце арнаменту яскрава бачныя контуры зрэзу біўня маманта. «У сваёй новай кнізе «Гістарычныя вытокі і лёсы дзяржаўных сімвалаў Беларусі» я прыводжу шэраг аргументаў на карысць хрысціянскага бачання сцяга. Чырвоны колер — гэта колер пакутніцтва, вечнага жыцця; зялёны — гэта сімвал вечнасці», — растлумачыў спадар Рассадзін. Шкада, не дажылі маманты да асэнсавання іх ролі ў станаўленні савецкай і постсавецкай сімволікі Беларусі.



Фота Юрыя Дзядзінкіна

### НАТАЛЛЯ ПЯТКЕВІЧ

Першы намеснік кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Наталля Пяткевіч паведаміла журналістам, што ў часы крызісу людзям хочацца «казкі», а не жахаў.

Выступаючы на форуме «СМІ ў эпоху глабальнага эканамічнага крызісу», спадарыня Пяткевіч зазначыла, што нагнятанне негатыўнай інфармацыі для журналістаў з'яўляецца сродкам павялічыць наклад, але палохае людзей, нават калі для іх страху няма аб'ектыўных прычынаў. «Калі цяжка, няўжо хочацца глядзець жахі? Не, часам хочацца і казкі», — сказала чыноўніца. Пяткевіч заклікала журналістаў прытрымлівацца балансу, калі падаецца інфармацыя. Толькі не пазначыла, якія суадносіны «казак» і «жахаў» найбольш аптымальныя для псіхікі чытача.

Акрамя таго, Наталля Пяткевіч падзялілася сваімі меркаваннямі адносна маральна-этычнага стану айчыннай журналістыкі: «Усё ж такі атрымалася захаваць, у адрозненні ад інстытутаў журналістыкі іншых краін, прыстойнасць і адказнасць». Відаць, спадарыня Пяткевіч не чытала артыкулаў у «Советской Белоруссии» — газеце Адміністрацыі прэзідэнта, калі на прадстаўнікоў апазіцыі выліваецца мора бруду, а людзі выстаўляюцца як неадэкватныя асобы.

**Падрыхтавала Вольга Хвоін**

МЕРКАВАННЕ

# СІМФАНІСТЫ

Раман ЯКАЎЛЕЎСКІ

**Амаль праз 15 гадоў пасля свайго абрання прэзідэнт Беларусі «ўзяў» і Апостальскі палац у Ватыкане. Звычайна на сустрэчу ў Папскую бібліятэку запрашаюць такіх гасцей толькі адзін раз. Падаецца, у цяперашняга Папы Рымскага Аляксандр Лукашэнка стаў першым беларускім госцем. Вядома, калі не лічыць пасла, які ўручаў даверчыя граматы.**





## Даведка:

Тэрмін «сімфонія» ў яго палітычным кантэксце — гістарычнае азначэнне спраў у Візантыі. Азначэнне «хрысціянскай манархіі», якая мела месца ў Рымскай імперыі часоў імператара Канстанціна. Менавіта тады нарадзіўся комплекс прававых поглядаў, які гісторыкі ўмоўна характарызуюць тэрмінам «візантызм». Асноўныя контуры такой сістэмы сучаснікам Канстанціна біскупам Яўсеем Кесарыйскім тады былі названыя «сімфоніяй уладаў», сутнасць якой заключаецца ў наступным:

1. Рэалізацыю хрысціянскіх пачаткаў абавязаная забяспечыць у зямным жыцці дзяржаўная ўлада — імператар (у нашым выпадку — прэзідэнт) — сумесна з царквой.
2. Царква робіць легітымнай дзяржаўную ўладу, дае санкцыю на дзяржаўны прымус, а дзяржава дае царкве сваю моц для аховы і ўвасаблення ў жыццё нормаў царкоўнага вучэння.

Асаблівасцю дадзенай сістэмы можа лічыцца яе прынцыпова «не юрыдычны» характар, адсутнасць як выразнага фармальнага замацавання, так і якіх-небудзь санкцый за парушэнне гэтай «няпісанай канстытуцыі» з боку манарха (прэзідэнта). «Сімфонія», у адрозненне ад заходняга прынцыпу падзелу ўладаў, прадугледжвае не ўзаемнае ўраўнаважванне фактараў дзяржаўнага жыцця, але іх зліццё ў адзінай волі самадзержца. І таму гэтая воля як бы аўтаматычна становіцца не самаўпраўствам абсалютнага манарха, але ўяўляе сабою юрыдычнае афармленне гіпатэтычнага народнага волевыяўлення, які робіць правам усё, што з'яўляецца такім з пункта погляду народнай прававой свядомасці, выхаванага на хрысціянскіх каштоўнасцях.

У тыя даўнія часы імператар Канстанцін упершыню ў гісторыі і паўстае як «біскуп знешніх спраў царквы», не з'яўляючыся пры гэтым царкоўным іерархам.

Высокі госць быў арыгінальным і ў тым, што прадставіў Папе свайго малодшага сына, які падарыў 82-гадоваму пантыфіку чытанку. Думаецца, што больш натуральна выглядала, калі б 265-ты Папа Рымскі ўручыў хлопчыку падарунак. Напрыклад, Біблію для дзяцей.

Аднак гэта малаістотныя назіранні. Куды больш цікавымі — чым далей, тым больш — могуць стаць магчымыя наступствы той сімфоніі саюза царквы і свецкай дзяржавы, якая разыгрываецца сёння таемна і відавочна. І месца, якое ў ёй адводзіцца Беларускаму экзархату Рускай Праваслаўнай Царквы. У аснове такога аб'яднання палягае нацыянальна-рэгіянальны прынцып. Беларускі экзархат афіцыйна можна называць і «Беларуская Праваслаўная Царква».

Яшчэ ў VI стагоддзі імператар Юсцініян першае месца адводзіў царкве. У Візантыі царква падпарадкоўвалася дзяржаўнай уладзе. Статус Ватыкана ў міжнародным праве — дапаможная суверэнная тэрыторыя Святога прастолу, рэзідэнцыя вышэйшага духоўнага кіраўніцтва Рымска-каталіцкай царквы. Як і каму падпарадкоўвалася праваслаўная царква пасля візантыйскай эпохі, вядома. Гаворка ідзе пра пятроўскія і савецкія часы самай вялікай часткі праваслаўнага свету — РПЦ і Маскоўскага Патрыярхату.

Сёння няма адзінага меркавання наконт таго, хто на каго больш уплывае ў постсавецкай Расіі — Крэмль на РПЦ ці наадварот. Але літаральна ўсе прызнаюць узрастаючую ролю ў духоўнай і іншых сферах жыцця краіны патрыярха Маскоўскага і ўсёй Русі Кірылы. Важным для разумення стану царквы з'яўляецца і тое, што імя экзарха ўзносіцца ва ўсіх храмах Беларускага Экзархата пасля імя патрыярха Маскоўскага і ўсёй Русі.

Падавалася б, патрыяршы экзарх усёй Беларусі мітрапаліт Філарэт мусіў прысутнічаць на сустрэчах свайго патрыярха з кіраўніком беларускай дзяржавы. За апошні час іх было ажно дзве — у Сочы і ў маскоўскай рэзідэнцыі патрыярха. Але гэтага не адбылося. Што стала падставай для некаторых экспертаў канстатаваць: інструменталізацыя царквы дзяржавай — характэрная рыса сімфоніі па-беларуску. Гэта значыць, святарства на службе ў царства. Як было ў Візантыі. Гавораць, што патрыяршаму экзарху ў свой час нават ледзь «вяртушку» не паставілі, каб мець кантакты без пасярэднікаў. Лёс гэтай ідэі застаецца невядомым.

Адчуванні сімфоніі толькі ўзмацніліся, калі прайшлі сепаратныя сустрэчы кіраўніка Беларусі ў сінодзе Беларускага Экзархата і ў згаданай маскоўскай рэзідэнцыі, пасля якой патрыярх Кірыла прызнаўся, што даведаўся шмат новага і невядомага пра Беларусь. Праўда, што канкрэтна ён даведаўся, так і не патлумачыў, і гэта магло спарадзіць некаторыя хваляванні ў сінодзе Беларускага Экзархата. Там свае апаратныя гульні. А ў нетрах беларускага рэжыму цалкам магло нарадзіцца пытанне: чаму б для большай дасведчанасці аб справах беларускіх не паставіць «нашаму патрыярху» «вяртушку»?

Невядомымі пакуль застаюцца і тыя перададзеныя пытанні патрыярха да Папы, пра якія гаварыў беларускі прэзідэнт. Магчыма, дастаткова было, што на 25-хвілінай сустрэчы з Папам Рымскім, як адзначыў Лукашэнка, яны «абмеркавалі многія праблемы, гаварылі пра ўзаемаадносіны рэлігій». І, як аказалася, яшчэ паспелі абмеркаваць «ўзаемаадносіны нашых Праваслаўнай і Каталіцкай цэркваў». Увогуле, трэба меркаваць, атрымалася сапраўдная сімфонія.

Калі пра такія ж узаемаадносіны дзвюх цэркваў «на належным узроўні» можна было чуць нясмелыя напаміны з царкоўных кругоў у Маскве, то пра некаторыя іх узаемаадносіны ў Мінску таксама будзе не лішнім узгадаць. Напрыклад, калі гаворым пра гісторыю стварэння першай на постсавецкай прасторы унікальнай адукацыйнай структуры, якой лічыцца Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ён паўстаў на аснове факультэта тэалогіі выгнанага Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта. Рэктар інстытута — доктар багаслоўя, мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, патрыяршы экзарх усёй Беларусі.

Але хто сёння публічна гаворыць пра ролю Рымска-каталіцкай царквы і кардынала Вальтэра Каспера ў стварэнні, у тым ліку і фінансаванні гэтага інстытута? Зусім нядаўна, калі быў прэзідэнтам Папскай рады па садзейнічанні хрысціянскаму адзінству, кардынал Каспер з'яўляўся адной з асноўных фігур у праваслаўна-каталіцкім дыялогу. Цікава, ці згадвалася імя кардынала падчас гістарычнай сустрэчы Лукашэнкі з Папам? Але ў Беларускай Праваслаўнай Царквы ёсць яшчэ і багаты досвед супрацоўніцтва з нямецкай каталіцкай царквой. Пра гэта б мог шмат распавесці протаіерэй Фёдар Поўны, загадчык Дэпартамента знешніх сувязяў Беларускага Экзархата.

Спачатку гэта структура займалася ў асноўным знешнеэканамічнай дзейнасцю, якая была засяроджаная на фармаванні эканамічнага базісу царкоўнай структуры, даволі хісткага ў часы перабудовы, узрушэнняў, інфляцыі і дэфолтаў. Не абышлося тут і без скандалаў. З Дэпартаментам была звязаная дзейнасць прадпрыемства «Дыяконія», зарэгістраванага пры Беларускім Экзархаце. Гэта прадпрыемства займалася гандлем прадуктамі харчавання, у тым ліку і алкагольнымі вырабамі, карыстаючыся пры гэтым палёгкамі ў падаткаабкладанні, устаноўленымі для царкоўных арганізацый. Калі гэты факт усплыў, ён атрымаў даволі шырокі негатыўны рэзананс, асабліва ў незалежных сродках масавай інфармацыі. Па некаторых дадзеных, высокай рэзалюцыяй заведзеную справу па гэтым прадпрыемстве было загадана прыпыніць, а не закрыць. З тых часоў дамоклаў меч так і вісіць над Экзархатам, што робіць яго паводзіны прадказальнымі больш для Мінска, чым для Масквы. Адмысловую каштоўнасць такі стан БПЦ набывае ва ўмовах, калі азначылася стратэгія Мінска на актывізацыю Саюзнай дзяржавы з дапамогай РПЦ. Але ў выкананні сімфоніі, складзенай самім Аляксандрам Лукашэнкам.

Так атрымалася, што менавіта протаіерэй Фёдар фактычна замяніў сваёй «Нядзельнай пропаведдзю» на канале АНТ «Слова пастыра» — аўтарскую праграму мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага і цяперашняга патрыярха Кірылы. У аснове праграмы — гутаркі ўладыкі з тэлегледачамі пра праблемы духоўнага жыцця, гісторыі Царквы. Відавочна, не без удзелу ўладаў такая змена вядучага была ўспрынятая тэлегледачамі неадназначна. І мітрапаліт Філарэт адважыўся папрасіць Лукашэнку вярнуць уладыку Кірыла беларускім тэлегледачам. Праўда, ужо пасля яго абрання патрыярхам Маскоўскім і ўсёй Русі.

Айцец Фёдар вядомы таксама як плябан Мінскага Храма ўсіх святых і кіраўнік Дома міласэрнасці, да будаўніцтва якога мелі дачыненне нямецкія каталікі. Меней вядома для вернікаў і няверуючых васьмігадовае паслушэнства Фёдара Поўнага ў храме — помніку рускай славы горада Лейпцыга ў Германіі. З некаторых часоў гэты горад сталі згадваць і ў сувязі з тым, што там працаваў Уладзімір Пуцін. Амаль у адзін час абодва вярнуліся з Германіі дадому. Адзін — у Піцер, другі — у Мінск. Можа, і знаёмыя яны ўжо тады былі. Хто ведае?

Сёння многія адзначаюць відавочную ролю ўплывовага протаіерэя ў адносінах Праваслаўнай царквы і беларускай дзяржавы. Пра гэта сведчыць гісторыя з яго адмовай ад месца ў верхняй палаце беларускага парламента, на якое яго вылучаў Мінскі гарсавет. Такое рашэнне протаіерэй Фёдар прыняў пасля сустрэчы з патрыярхам Алексіем II, які ў цэлым «станоўча ўспрыняў інфармацыю пра вылучэнне ў сябры Савета Рэспублікі», але ўсё ж «адзначыў праблему, якая стаіць перад Праваслаўнай царквой, — захаванне адзінства Царквы, пазбяганне расколу, які магчымы з-за таго, што некаторыя святары занадта актыўна ўключаюцца ў палітычную дзейнасць». У беларускай сімфоніі ўлады і Царквы вядома, хто вызначае градус палітычнай актыўнасці. Разам з тым, у некаторым сэнсе адзін з вядучых работнікаў Беларускага Экзархата Маскоўскага патрыярхату застаецца публічнай асобай Царквы для наменклатуры, якая моцна здзівілася, калі не ўбачыла гэтым разам, як гэта звычайна было раней, свайго кіраўніка з мітрапалітам Філарэтам на набажэнстве ў праваслаўны Вялікдзень напярэдадні першага візіту ў Ватыкан.

А наступствы сустрэчы Лукашэнкі з Папам у бібліятэцы, дзе яны абмяркоўвалі ўзаемаадносіны з Рымска-каталіцкай царквой, бачацца такімі — удасканаленне міждзяржаўных і іншых сувязяў з Ватыканам праз Германію, а не праз гістарычна блізкую Польшчу. Гэта ўкладваецца ў рэчышча цяперашніх адносінаў Масквы да польскага Касцёла і наогул да Варшавы.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# УСЁ ПАД КАНТРОЛЕМ

Вольга ХВОІН

**«Сітуацыя ў эканоміцы Беларусі складаная, але ўсё пад кантролем», — заявіў міністр эканомікі Мікалай Зайчанка на прэс-канферэнцыі, падводзячы вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за першы квартал бягучага года.**



Photo.ByMedia.Net

## Крызіс кампенсуем будаўніцтвам

Мікалай Зайчанка адзначыў, што тэмпы росту валавога ўнутранага прадукту ў першым квартале гэтага года склалі 101,1 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду 2008 года, пры прагнозе на год 110–112 працэнтаў. Пры гэтым міністр падкрэсліў, што Беларусь — адна з нямногіх краін, дзе захоўваецца станоўчая дынаміка гэтага паказчыка. Паводле яго слоў, найбольш ад эканамічнага крызісу пацярпела прамысловасць. Спад назіраецца ў аўтамабілебудаванні, вытворчасці трактароў і сельскагаспадарчай тэхнікі — каля 30 працэнтаў. Звязана гэта найперш з тым фактарам, што галіна на 70 працэнтаў арыентавана на экспарт. У студзені — сакавіку індэкс фізічнага аб'ёму прамысловай прадукцыі склаў 95,5 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года.

Чыноўнікі прагназуюць, што па выніках паўгода гэты паказчык будзе на ўзроўні 97 працэнтаў. Эканамічны крызіс пачаў аказваць уплыў на прамысловасць краіны яшчэ з восені 2008 года. Тады праявілася тэндэнцыя зніжэння індэкса прамысловай вытворчасці да ўзроўню кожнага папярэдняга месяца. У выніку вытворчасць прамысловай прадукцыі ў снежні да ўзроўню жніўня 2008 года склала 78,2 працэнта. Найлепш пачуваюцца паліўная, нафтахімічная і металургічная галіны прамысловасці, у якіх адзначаецца станоўчая дынаміка вытворчасці.

У Міністэрстве эканомікі адзначаюць, што станоўчага паказчыку ВУП удалося дасягнуць за кошт кампенсуючых галінаў: будаўніцтва і будаўніча-мантажных работ, харчовай прамысловасці і гандлю. За першы квартал было ўведзена ў эксплуатацыю 1327,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, што складае 22 працэнта ад гадавога плану. Да канца верасня мяркуецца здаць у эксплуатацыю 5 тысяч квадратных метраў жылля. Аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі па выніках першага квартала павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам на 6,3 працэнта. На пытанне журналістаў, як атрымалася вывесці на дадатны ўзровень паказчыкі працы харчовай галіны ў міжсезонны час, Мікалай Зайчанка патлумачыў, што, у прыватнасці, павялічылася вытворчасць малака і малочнай прадукцыі.

Вытворчасць спажывецкіх тавараў у першым квартале 2009 года склала 100,5 працэнта да ўзроўню студзеня — сакавіка 2008 года (прагноз на год 112–113 працэнтаў).

«Сёння мы не маем на мэце дасягнуць нейкага ўзроўню ў працы эканомікі, але імкнёмся захаваць станоўчую дынаміку з захаваннем нарматыўных запасаў гатовай прадукцыі на складах», — падкрэсліў міністр эканомікі.

Што тычыцца інвестыцый у асноўны капітал, то ў першым квартале гэтага года іх аб'ём узрос на 20 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Па выніках шасці месяцаў плануецца выйсці на паказчык у 15–20 працэнтаў прыросту.

## З мінусу атрымліваем плюс

У знешнеэканамічнай дзейнасці па-ранейшаму назіраецца спад. Аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі, разлічаны па метадалогіі плацежнага балансу, за студзень — люты склаў 7 мільярдаў долараў ЗША. У тым ліку экспарт — 3,1 мільярды долараў, імпарт — 3,9 мільярда долараў. У параўнанні са студзенем — лютым 2008 года аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі склаў 61,7 працэнта пры прагнозе на год 116,2–117,7 працэнта, экспарт — 55 працэнтаў (прагноз — 117–118,5 працэнта), імпарт — 68,2 працэнта (прагноз — 115,5–117 працэнтаў). За першыя два месяцы бягучага года па метадалогіі плацежнага балансу склалася адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі — 815 мільёнаў долараў (па прагнозу на 2009 год велічыня адмоўнага сальда мусіць быць 1470–1500 мільёнаў долараў).

Міністр эканомікі Мікалай Зайчанка адзначыў спад рэнтабельнасці вытворчасці. У цэлым па краіне за першыя два месяцы рэнтабельнасць склала 7,7 працэнта супраць 14,2 за аналагічны перыяд 2008 года.

У справаздачы Мінэканомікі адзначаецца, што ў рэспубліцы «мае месца няпоўная занятасць, абумоўленая вымушаным пераходам асобных вытворчасцяў на скарочаны графік працы». Але «сітуацыя на рынку працы застаецца кантралюемай і кіруемай, а рэжым вымушанай няпоўнай занятасці выкарыстоўваецца як антыкрызісная мера і праяўленне сацыяльнай адказнасці з боку наймальнікаў у адносінах да работнікаў». На фоне гэтых працэсаў у міністэрстве канстатуюць рост рэальнай заработнай платы ў студзені — сакавіку на 3,6 працэнта.

Мікалай Зайчанка паведаміў, што не з'яўляецца прыхільнікам рэзкай дэвальвацыі і цяпер «не бачыць падстаў для разавай дэвальвацыі беларускага рубля». Паводле папярэдніх прагнозаў, інфляцыя ў красавіку бягучага года не перавысіць 0,6 працэнта, а па выніках чатырох месяцаў складзе 6,7 працэнта (аналагічны перыяд 2008 года — 5,3 працэнта). «Мы стартавалі з вельмі высокай інфляцыяй, што было наканавана студзеньскай дэвальвацыяй і ростам тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі», — адзначыў міністр эканомікі. Па выніках паўгоддзя інфляцыя прагназуецца на ўзроўні 8 працэнтаў. Прагноз на 2009 год пакуль не карэкціруецца і застаецца ў межах 11 працэнтаў. «На другое паўгоддзе застаецца 3 працэнта інфляцыі. Гэта вельмі аптымістычна, складана, але рэальна», — лічыць міністр.

## Рыхтуюцца палёгкі

Сярод мераў, якія дазволяць лібералізаваць умовы працы беларускіх прадпрыемстваў, намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур назваў плануетмую адмену ліцэнзавання 14 відаў дзейнасці. Адпаведны праект указу знаходзіцца ў фінальнай стадыі распрацоўкі. Змены закрануць найперш сферу паслуг: турызм, рознічны гандаль, адукацыю, транспарт, страхавыя, натарыяльныя і рыэлтарскія паслугі. Па падліках Мінэканомікі, выключэнне нават аднаго віду ліцэнзавання рознічнага гандлю дазволіць скараціць колькасць ліцэнзій больш чым на 40 працэнтаў.

Вядзецца праца па скарачэнню колькасці адміністрацыйных працэдур. Напрыклад, органы санітарнага кантролю скарацілі іх амаль на 60 працэнтаў, Міністэрства ахоўы здароўя — на 30 працэнтаў. Паводле Андрэя Тура, цяпер распрацоўваюцца праекты ўказаў па арэндзе, кантрольнай дзейнасці, разглядаецца магчымасць унясення змяненняў у Адміністрацыйны кодэкс Беларусі.

У Міністэрстве эканомікі адзначаюць і попыт на спрошчаную сістэму падаткаабкладання. На 1 студзеня 2009 года па спрошчанай схеме падаткі сплачвалі 35 тысяч прадпрымальнікаў і юрыдычных асобаў, цяпер гэтай палёгкай карыстаюцца 65,6 суб'ектаў гаспадарання.

КАМЕНТАР

# БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ НА СКЛАД

**Мы звярнуліся па каментар аптымістычных прагнозаў міністра эканомікі Мікалая Зайчанкі да вядомых у краіне эканамістаў Станіслава Багданкевіча і Леаніда Злотнікава.**



Станіслаў Багданкевіч

**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Вялікая розніца».
**22.10** Закрыты паказ. Прэм'ера. Фільм Аляксея Учыцеля «Палонны».
**00.45** «Наша Belarussia».
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавела.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Дабры дзень, доктар!»
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс» з Паўлам Каранеўскім.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** КВЗ. Першая ліга. 1/8 Фіналу.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.25** Агляд міжнароднага шоу-бізнэсу.
**00.05** «Для тых, хто не спіць»: Жан-Клод Ван Дам у фільме «У пекле». ЗША, 2003 г.

---

**06.55** «Добрая раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Серыял «Тэрмінова ў нумар!».
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Час футбола.
**10.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.25** «Лабірынты: сеча пад Хоцінам або апошні бой гетмана».
**11.55** Вясковы дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы» (Расія).
**12.40** Вострасюжэтны серыял «Куля-дура» (Расія). 4-я серыя, заключная.
**13.30** «Паціна гадоў». Генрых Страдаў (Беларускае тэлебачанне).
**13.50** Мультфільм.
**14.10** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Школа рамонту.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.20** Бітва экстрасэнсаў.
**20.30** Калыханка.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.00** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-4» (ЗША).
**23.20** Хакей. НХЛ. Матч тыдня.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Карменіта».73 серыя.
**10.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Цалуй мяне мацней». Дак. фільм.
**12.30** Тэлесерыял «Лэдзі Мэр».
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Каханне без права на перамогу». Дакументальны серыял. Фільм 3-і.
**14.55** Тэлесерыял «Утраіх супраць усіх-2».
**15.50** Фільм «Зімовая вішня». 4 серыя.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «гарадок». Дайджэст.
**17.55** Тэлесерыял «Лэдзі Мэр», 2001 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.50** Вялікі юбілейны вечар Уладзіміра Вінакура. «60 гадоў, а я не веру».
**23.10** Навіны - Беларусь.
**23.20** Сяргей Баталаў і Андрэй Іллін у фільме «Артыст і майстар малюнка».
**01.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Дачны адказ».
**10.25** «Руская не здаюцца!».
**10.50** «Шнур вакол свята».
**11.20** Серыял «Крывавы круг».
**12.10** Прыгодніцкі камедыйны баявік «Жоўты цмок».
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Прэм'ера. Дар'я Чаруша ў вострасюжэтным серыяле «Захопнікі».
**21.30** Прэм'ера. Аляксандр Лыкаў у дэтэктыўным серыяле «Версія».
**23.25** Баявік.

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 6-ы этап.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Групавы этап. Германія - Нідэрланды.
**12.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**13.45** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Чвэрцьфінал. Прамая трансляцыя.
**16.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 7-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Футбол. Еўрагалы. Франк Рыберы.
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**20.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Чвэрцьфінал.
**22.00** Спартовыя бальныя танцы. Паказальныя выступы ў Манака.
**23.30** Покер. Турнір Partouche (Францыя).
**00.30** Экстрэмальны спорт. Лепшыя моманты.
**01.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 7-ы этап.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 6 серыя.
**19.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.25** Маю права (прававаяая праграма).
**19.40** З архіву «Jazz Jamboree»: «Рэй Чарлз», ч. 2.
**20.15** Рэпарцёр (тэлечасопіс).
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.15** Госць «Белсату» (публіцыстычная праграма).
**21.30** «Панна Ніхто», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1996 г., Польшча.
**23.10** «Апошні сезон», серыял: 3 серыя.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

## 16 МАЯ, СУБОТА

---

**06.25** Моладзевы серыял «Сэрца акіяна» (Францыя).
**06.50** Брытва Оккама.
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05, 11.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**09.45** Здароўе.
**10.20** Шпілька.
**11.00** Ранішняя хваля.
**11.35** «Off stage life».
**12.10** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**12.20** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Сатырычная камедыя «Ты - мне, я - табе» (СССР).
**14.00** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**14.05** Дакументальны серыял «Таямніцы забытых перамог» (Расія).
**14.30** «Будні чэмпіёнаў». Дар'я Домрачава.
**14.55** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**16.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.40** Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
**17.40** Відэафільм АТН «Бабруйскі варыянт» цыкл «Зямля беларуская».
**17.55** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Меладрама «Заклад на каханне» (Украіна -- Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** «Еўрабачанне. Масква-2009».
**22.00** Фінал конкурсу песні «Еўрабачанне-2009». Прамая трансляцыя.
**01.00** Уласнай персонай.

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** «Казка пра цара Салтана». Мультфільм.
**11.55** Георгій Буркоў, Алена Маёрава ў фільме «Двое і адна».
**13.20** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.50** «Кінаметры вайны». «Даследаванне ДНК. Вам заданне».
**14.20** «Вам заданне». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** «Невядомыя дзеці вядомых бацькоў».
**17.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.50** Ян Ургант, Данііл Співакоўскі ў фільме «Трое і сняжынка».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Камедыя «Дзень радыё».
**23.00** Энтані Хопкінс у меладраме «На зыходзе дня».

---

**07.05** «Анфас».
**07.20** «Гарачы лёд».
**07.45** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.10** «Сямейнае кіно»: музычны фільм «Як каваль шчасце шукаў». Украіна, 1999 г.
**09.30** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**10.55** «Мінск і мінчукі».
**11.30** «Каханне маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя вандраванні дылетанта».
**13.00** «Залатая калекцыя»: «У страляючай глушы». СССР, 1986 г.
**14.35** «Дарагая перадача».
**15.05** «Рэальны спорт».
**15.20** «Ваенная таямніца» з Ігарам Пракапенкам.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** Агляд міжнароднага шоу-бізнэсу.
**17.20** «Нашы рэкорды».
**18.10** «Top Gear. Руская версія».
**19.05** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Сусветны блокбастар»: «Паляўнічыя за розумам». ЗША-Фінляндыя-Вялікабрытанія, 2004 г.
**22.10** Канцэрт Міхася Задорнава.
**23.55** «Арт-хаўс»: фільм рэжысёра Джэймса Айворы «Бамбейская гісторыя». ЗША.
**01.45** «Сеанс для дарослых»: фільм «Забароненыя фантазіі». ЗША, 2004 г.

---

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.10** Серыял для дзяцей «Філ з будучыні» (Вялікабрытанія- ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Таемны густ.
**10.35** Жансавет.
**11.05** Школа рамонту.
**12.10** Невытлумачальна, але факт.
**13.00** «Лабірынты: ключ ад Літвы».
**13.30** Жарсці па культуры. Ток-шоу.
**14.10** Жаночая ліга.
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Юнайтэд-Арсенал. Прамая трансляцыя.
**16.45** Фантастычная камедыя «Маска» (ЗША).
**18.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Дынама (Мінск)-Нафтан. Прамая трансляцыя.
**20.55** Жаночая ліга.
**21.30** Драма «Колер грошай» (ЗША).
**23.45** Казанова.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** Івар Калныньш і Гунар Цылінскі ў фільме «Ранняя іржа». 1979 г.
**08.50** «Суботнік».
**09.30** «Ранішняя пошта» з Юрыем Мікалаевым і Ларысай Грыбалёвай».
**10.05** «Мой срэбны шар. Сяргей Мартынсон». Вядучы - Віталь Вульф.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Пакой смеху».
**12.30** Дакументальны фільм.
**13.00** Аляксандр Дамагараў і Ўладзімір Іллін у дэтэктыве «Вяртанне Турэцкага». Фільм 8. 1 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** Прыгодніцкі фільм «Сэрцы трох». 1997 г.
**19.00** Весткі у суботу.
**19.30** Фільм «Сямейная вячэра». 2007 г.
**21.25** Прэм'ера. Фільм «Тармазны шлях». 2007 г.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Асабліва небяспечны!».
**14.05** Прыгодніцкая фантастыка «Выспа страчаных душ».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. «Раман Карцаў. 70 гадоў». Да юбілею артыста.
**17.10** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія - рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**23.00** Фантастычны трылер «Заражаны».
**00.40** Гістарычная драма Олівера Хіршбігеля «Бункер».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Франк Рыберы.
**10.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 7-ы этап.
**10.50** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Паўфінал.
**12.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Паўфінал.
**13.00** Аўтаспорт. Міжнародная формула Мастерс у Францыі (По). 1-я гонка. Прамая трансляцыя.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**16.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 8-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал. Першы матч. «Зорка-2005» (Расія) - «Дуісбург» (Германія). Прамая трансляцыя.
**20.45** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі (Мадрыд). Паўфінал.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Сусветны Гран-пры (Йокагама, Японія).
**01.00** Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал. Першы матч. «Зорка-2005» (Расія) - «Дуісбург» (Германія).
**02.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 8-ы этап.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**18.40** «Рабінзоны Мантсінсаары», дак. фільм, 2008 г., Беларусь–Германія–Фінляндыя–Францыя.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.20** «Добрыя мясціны», дак. фільм, рэж. Нэнсі Брант, 2006 г., Германія.
**20.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Розныя светы», дак. фільм, рэж. Марка Шкоп, 2005 г., Славакія.
**22.35** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**23.00** Суботні сеанс: «Нехта назірае», трымценнік, рэж. Даглас Джэксан, 2000 г., Канада.
**00.30** Аб'ектыў (навіны).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 17 МАЯ, НАДЗЕЛЯ

**1**

**07.25** Прыгодніцкі фільм «Выспа скарбаў» (СССР).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 11.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.10** Культурныя людзі.
**10.45** Усе стыхіі.
**11.20** У свеце матораў.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Камедыя «Гараж» (СССР).
**14.05** Дакументальны цыкл «Мая праўда». Лія Ахеджакава (Украіна).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Nota Bene.
**16.05** Прэм'ера. Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША). 1-я і 2-я серыі.
**17.55** Суперлато.
**18.55** «Зорныя танцы».
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоу.
**21.00** «Панарама тыдня» з Юрыем Пракопавым.
**22.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.40** Баявік «Эскадрылля «Лафайет» (Вялікабрытанія - ЗША).

**ОНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная прапаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі» з Дзмітрыем Крыловым.
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** «Ранішняя пошта».
**13.05** «Зваротны адлік». «Палюбоўнікі Вялікай Мядзведзіцы».
**13.35** «Пеця і Чырвоны Капялюшык». Мультфільм.
**13.50** Джулія Робертс у камедыі «Сталёвыя магноліі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.35** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**17.25** «Песні маёй краіны». Фінал.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** Вострасюжэтны фільм «Знак лёсу».
**23.40** «Камедзі Клаб».
**00.10** Пірс Броснан у камедыі «Знікненні Кевіна Джонсана».

**СТВ**

**06.45** «Праверана на сабе».
**07.30** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.20** «Кіно»: Віталь Юшкоў і Наталля Флярэнская ў фільме «Алёша». СССР, 1980 г.
**09.30** «Дабры дзень, доктар!».
**10.00** Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** «Залатая калекцыя»: Сяргей Парфёнаў і Альберт Філозаў у фільме «Залатая баба». СССР, 1986 г.
**14.30** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Ефрэмавым.
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Дыялогі аб музыцы.
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** «Фільм тыдня»: «Толькі пасля вас». Францыя, 2003 г.
**22.35** «Спартовы тыдзень».
**22.55** «Сусветны бокс».
**23.50** «Агенцтва «Залатая куля». Серыял.

**ЛАД**

**08.10** Дабравест.
**08.35** Мір вашаму дому.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.20** Прыгодніцкі серыял «Капітан Нэма» (СССР). Заключная серыя.
**11.30** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**12.10** Сезон у дачы.
**12.50** Пасоўванне+.
**13.05** Слова пісьменніка.
**13.40** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці» (ЗША).
**14.30** Прыгодніцкі серыял «Мушкецёры праз 20 гадоў» (Расія). 1–4 серыі.
**20.15** Тэлебарометр.
**20.35** Экспедыцыя.
**21.05** Моладзевы фільм «Трымай рытм» (ЗША).
**23.20** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**23.35** Свая музыка.
**00.05** Пасоўванне+.

**РОССИЯ**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.25** Мікалай Гаплікаў, Лідзія Смірнова і Клара Лучко ў фільме «Аблудныя». 1966 г.
**08.45** Івар Калныньш у дэтэктыве «Падарункі па тэлефоне». 1977 г.
**10.25** «Смехапанарама» Яўгенія Петрасяна.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Каралева тыграў. Маргарыта Назарава». Дакументальны фільм.
**13.00** «Вяртанне Турэцкага». Фільм 8. 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Ах, вадэвіль, вадэвіль». 1979 г.
**15.50** «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**20.30** Прэм'ера. Фільм «Паляванне на піраннію», 2006 г.
**22.55** Камедыя Дзмітрыя Астрахана «Тартарен з Тараскона», 2003 г.
**01.05** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі мір» з Цімафеем Бажэнавым.
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Выратавальнікі».
**10.50** «Прафесія - рэпарцёр».
**11.20** «Авіятары».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Крамлёўскія пахаванні». Аляксей Ларыёнаў.
**14.10** Стывен Сігал у баявіку «Кароль клеткі».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Змаганне за ўласнасць».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.05** «Галоўны герой» з Антонам Хрякавым.
**22.15** Венсан Перес у містычным баявіку «Крумкач: горад анёла».
**23.50** «Футбольная ноч».

**EUROSPORT**

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Францыі. Кваліфікацыя.
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Францыі. Warm-Up. Прамая трансляцыя.
**10.30** Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал. Першы матч. «Зорка-2005» (Расія) - «Дуісбург» (Германія).
**11.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 8-ы этап.
**12.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР. Суперпоул.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР. Заезд 1-ы. Прамая трансляцыя.
**13.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Францыі (Па). 1-я гонка. Прамая трансляцыя.
**14.45** Аўтаспорт. Міжнародная формула Мастерс у Францыі (Па). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Францыі (Па). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**16.45** Веласпорт. «Тур Італіі». 9-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў ПАР.
**19.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР. Заезд 2-і.
**20.00** Мотаспорт па выходных.
**20.30** Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі. Фінал.
**22.00** Бокс. Міжнародны паядынак у Канадзе. Сярэдняя вагавая катэгорыя. З. Дземерс (Канада) - М. Берыуаме (Канада).
**00.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 9-ы этап.
**01.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР. Заезд 2-і.
**02.00** Мотаспорт па выходных.

**БЕЛСАТ tv**

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**18.15** «Ранча», серыял: 28 серыя.
**19.05** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**19.35** «Святаслаў Фёдараў – жыццё пасля смерці», дак. фільм, рэж. Юрый Хашчавацкі, 2006 г., Беларусь, ч. 3: «Змагар».
**20. 05** Форум (ток-шоу): Шлюб па разліку.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Давыд Гарадзенскі» (пазнаваўчая праграма).
**21.25** «Акно ў Еўропу».
**21.55** Фільматэка майстроў: «Дом дурняў», драма, рэж. Андрэй Канчалоўскі, 2002 г., Расія.
**23.40** «Права быць свабодным» — канцэрт альтэрнатыўнай музыкі — Луцк-2007, ч. 2: выступ гурта «Neuro Dubel».
**00.05** Аб'ектыў.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.

____________________ (сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________________

Адрес ____________________ (почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў» (получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск (наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
____________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик
Пеня ________
Всего ________
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў» (получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск (наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
____________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик
Пеня ________
Всего ________
Кассир

ЦІКАВА

# ДРУГІ БОК ЭПІДЭМІІ

Іван БІЧ

**Гісторыю чалавецтва нельга разглядаць асобна ад гісторыі хваробаў. Наступствамі кожнай вялікай эпідэміі былі змены ў шматлікіх сферах грамадскага жыцця, часам нават пазітыўныя.**



У 2002 годзе Сусветная арганізацыя здароўя прыйшла да высновы, што інфекцыйныя хваробы становяцца прычынай 22 працэнтаў смерцяў у сучасным свеце. А ў бедных краінах Поўдня працэнт яшчэ большы. У Афрыцы і Лацінскай Амерыцы 50 працэнтаў усіх смерцяў звязаныя з інфекцыйнымі хваробамі (для параўнання, у індустрыяльна развітых краінах толькі 5–10 працэнтаў). Праўда, радавацца жыхарам ЗША і Еўропы занадта рана. Ва ўмовах глабальнага пацяплення трапічныя хваробы стануць звычайнай з'явай у краін, якія ляжаць ва ўмераных шыротах.

Што тычыцца эканамічнага ўрону ад эпідэмій, то тут нават цяжка назваць лічбу. Відавочна, што яна папросту астранамічная. Дастаткова згадаць падлікі, якія прывяла Амерыканская акадэмія педыятрыі. Нават самая нязначная хвароба дзіцяці каштуе амерыканскай сям'і 1235 долараў (падзенне працаздольнасці бацькоў, лекі, вітаміны, дадатковыя сродкі і час на розныя прафілактычныя мерапрыемствы). Эпідэмія птушынага грыпу 2003 года, якой перабалела ўсяго 7 тысяч чалавек, каштавала 30 мільярдаў долараў ЗША.

Аднак эпідэміі выклікаюць не толькі смерць і гора. Напрыклад, эпідэмія воспы, якая выбухнула ў персідскай арміі ў 480 годзе да нашай эры (яе ахвярай стаў таксама цар Ксеркс), дазволіла Грэцыі захаваць незалежнасць і развіваць сваю культуру і інстытуты дэмакратыі, што ў перспектыве аказала каласальны ўплыў на ўсю сусветную цывілізацыю.

А вось гэтак званая «чума Юсцініяна», наадварот, падрыхтавала глебу для занядпаду рымскай цывілізацыі. Хвароба з'явілася ў сярэдзіне VI стагоддзя ў Эфіопіі або ў Егіпце. Адсюль яна распаўсюдзілася па большай частцы Візантыі і іншых краін рэгіёну. За 50 гадоў ад яе памерла прыблізна сто мільёнаў чалавек. Толькі ў Канстанцінопалі вымерла 40 працэнтаў насельніцтва. Другая хваля чумы, якая прыйшлася на канец стагоддзя, пайшла далей на Захад. Яна забрала жыцці 25 мільёнаў чалавек. Як вынік, Італія абязлюдзела і хутка стала лёгкай здабычай варвараў-германцаў.



Старадаўні Рым таксама вельмі моцна пацярпеў у палітычным плане ад так званай «чумы Антаніяна». Гаворка ідзе пра воспу, якую завезлі ў Італію легіянеры, што вярталіся з усходніх паходаў. Воспа забіла 5 мільёнаў чалавек, і ў тым ліку імператара і выбітнага філосафа Марка Аўрэлія.

У сярэдзіне XIV стагоддзя свет ахапіла эпідэмія «чорнай смерці» — чумы, якая забрала ў магілу трэцюю частку насельніцтва Азіі і чвэрць або палову (ёсць розныя думкі на гэты конт) еўрапейцаў. Агульная колькасць памерлых вымяраецца лічбай 140–150 мільёнаў чалавек. Палітычнай рэакцыяй на катастрофу стала хваля сацыяльных выступаў — Жакерыя ў Францыі, паўстанне Уота Тайлера ў Англіі, бунт гараджан у Фларэнцыі.

Але, як адзначаюць гісторыкі, ускосным наступствамі той эпідэміі стала бурнае развіццё еўрапейскай цывілізацыі. Паколькі рабочых рук стала менш, даводзілася плаціць працоўным больш. З'явіўся сярэднявечны сярэдні клас, правобраз буржуазіі. Страх перад новымі хваробамі садзейнічаў папулярызацыі гігіены цела. «Чорная смерць» таксама падштурхнула пачатак эпохі геаграфічных адкрыццяў. Лічылася, што перац, гваздзіка эфектыўна дапамагаюць у барацьбе з чумой. Багацеі ахвотна ўкладалі грошы ў замежныя экспедыцыі за падобнымі спецыямі.

Асабліва трэба адзначыць ролю эпідэмій у развіцці медыцыны. Напрыканцы XIX стагоддзя ў розных партах свету былі зафіксаваныя ўспышкі чумы. Вірус перадавалі карабельныя пацукі. Аднак на гэты раз эпідэмія чумы стала пачаткам яе канца. Урады шматлікіх краін уклалі каласальныя сродкі ў медыцыну. У выніку ў 1894 годзе быў выяўлены ўзбуджальнік чумы, а пазней адкрыты сродак барацьбы з хваробай.

Некалькі пандэмій халеры, якія прайшліся ў XIX стагоддзі па Еўропе, прымусілі нават арыстакратаў выступаць за бясплатную медычную дапамогу насельніцтву. Важным наступствам эпідэмій было стварэнне сеткі міжнародных арганізацый гуманітарнай і медычнай дапамогі (таварыства Чырвонага крыжа, Сусветная арганізацыя аховы здароўя).

Часам эпідэміі былі прычынамі змены рэлігійных настрояў. Так, чума на Кіпры ў 250–271 гадах прывяла да масавага пераходу людзей у хрысціянства. Эпідэмія воспы ў Японіі (VIII–IX стагоддзе) садзейнічала трыумфальнай экспансіі будызму.

Узняла ролю царквы эпідэмія сіфілісу ў XV стагоддзі. З Новага Свету ў Еўропу трапіла Treponema pallidum. Эпідэмія стала бічом для кантынету. Аднак аўтарытэт рэлігіі ў грамадстве павысіўся, паколькі існавала перакананне, што хварэюць на сіфіліс перш за ўсё грэшнікі. Дарэчы, лічыцца, што не столькі канкістадоры, колькі невядомыя жыхарам Новага Свету хваробы знішчылі 80 працэнтаў індзейцаў у першых іспанскіх калоніях. Калі б гэтага не было, то, як піша гісторык Майкл Олдстоўн, свет выглядаў бы сёння абсалютна інакш. Іспанцы спакойна б эксплуатавалі тых індзейцаў, не мелі б матывацыі ваяваць з індзейскімі дзяржавамі Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі і завозіць рабоў з Афрыкі.



Нарэшце, трэба прызнаць, што наступствамі эпідэмій звычайна быў выбух ксенафобіі на адрас якіх-небудзь нацыянальных і культурных меншасцяў. Іх прадстаўнікоў абвінавачвалі ў тым, што менавіта яны былі віноўнікамі хваробы. У Еўропе, напрыклад, «крайнімі» рабілі яўрэяў і цыган. У прынцыпе, такія клішэ захаваліся і па сённяшні дзень. Памятаеце, у 1980-я гады хадзіў міф, што СНІД перадаецца выключна гомасексуалістам.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Рэжым прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, які ў свой час назвалі «апошняй дыктатурай у Еўропе», карыстаецца жудаснай рэпутацыяй, і раней Брусель уключаў яго ў свой чорны спіс. Аднак, даслаўшы запрашэнне, ЕС зноў дае сігнал пра тое, што кааперацыя на базе ўзаемнага інтарэсу больш выгодная, чым канфрантацыя. Лукашэнка адрэагаваў пазітыўна, і цяпер кажа, што яго краіна — «мост паміж Усходам і Захадам».

**«Guardian» (Вялікабрытанія)**

«Мне Беларусь увогуле падабаецца — таму што там няма крыміналу і жыццё куды прасцей, чым у нас. Аднак праблема ў іншым — уся гэта стабільнасць, шытая белымі ніткамі, трымаецца на адной асобе. Сыдзе яна (а сыдзе рана ці позна) і… усяму гэтаму раю. І не ў тым пытанне, добры або дрэнны правіцель. Справа ў сістэме. Вось вы тут пішыце, што прамысловасць у Беларусі захавалі. Так. Аднак прадукцыя іхняя нікому ў свеце не патрэбная. Не здольныя бульбашы пры сваёй сацыялістычнай сістэме даць нармальную якасць. «Вольва» або «Ман» у 3–4 разы даражэй, аднак нармальная фірма для магістральных перавозак набудзе «Ман», таму што ён на два парадкі надзейней. «Катэрпілер» у пяць разоў даражэй за БелАЗ, аднак па ўсяму свету ў горнай прамысловасці «Каты». БелАЗы нават у Расіі перасталі набываць. Штучная краіна, штучная гаспадарка, якая трымаецца на палітычных амбіцыях… Там хутка будзе куды горш, чым у Расіі.

**Каментар на сайце Forum.msk (Расія)**

Еўрасаюз нарэшце зразумеў, што ідэалы істотныя, аднак яны менш важныя за інтарэсы, а іх нельга абараняць з дапамогай беларускіх дэмакратаў, якія не карыстаюцца падтрымкай у сябе у краіне. Калі Брусель будзе і далей ужываць падобную тактыку, то зможа выклікаць дэмакратычныя змены на Беларусі. Еўропа здолела рабіць у дачыненні да Беларусі рэчы, якія не можа дазволіць сабе Абама адносна Кубы.

**«Przekryj» (Польшча)**

Іншая справа — Беларусь і Арменія. Яны — стратэгічныя партнёры Расіі, якая зацікаўлена ў развіцці з імі ваенна-палітычных і эканамічных адносін. У сваю чаргу, у Мінску і Ерэване неаднаразова казалі пра адданасць курсу на развіццё адносін з Расіяй. Аднак кіраўніцтва гэтых краін усё часцей глядзіць на Захад. (…) «Усходняе партнёрства» фактычна ставіць Расію перад фактам, калі ёй у завуаліраванай форме прапануюць развітацца са сваімі геапалітычнымі амбіцыямі, не разглядаць больш постсавецкую прастору як зону сваіх асаблівых інтарэсаў.

**«Независимая газета» (Расія)**

Цяпер Беларусь — гэта, з аднаго боку, сучасны свет з 500 групамі на Facebook, радзіма маладога народу, які жыве музыкай і інтэрнэтам, з другога — краіна, якая прыгнятаецца «прэзідэнтам», якога называюць «апошні дыктатар Еўропы».

**«L'Espresso» (Італія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. ЛЕНІН ЧЫТАЕ КАЧЫНЬСКАГА

Супярэчлівую правакацыю арганізаваў на 1 мая вядомы ў Польшчы акцёр Януш Палікот, вядомы як заўзяты апанент прэзідэнта Леха Качыньскага. Акцёр арганізаваў публічнае чытанне псеўдадоктарскай працы прэзідэнта. Фішка ў тым, што тэкст той працы чыталі акцёры ў грыме Леніна, Маркса і Энгельса. Закончылася імпрэза скандаваннем: «Няхай жыве таварыш Качыньскі!» На закуску Палікот заявіў, што Лех — латэнтны марксіст. Канцэпцыя мерапрыемства палягае ў тым, што бібліятэка Гданьска, дзе знаходзіцца арыгінал працы Качыньскага, адмаўляецца выдаваць яе на рукі. Гэта выклікае падазрэнне, што яна напісаная на базе марксісцкай філасофіі. Выхадка Палікота не засталася незаўважанай з боку партыі «Права і Справядлівасць» (PiS), старшынёй якой з'яўляецца Качыньскі. Прэс-сакратар назваў учынак Палікота «агідным». Акцыя Паліткота дала правым нагоду для атакі на партыю ліберальных праціўнікаў PiS, сябрам якой ёсць Паліткот. Справа ў тым, што апошні правёў свой хэпінінг у той час, калі Качыньскі знаходзіўся ў шпіталі каля хворай маці.

**Па матэрыялах «Wprost» (Польшча)**

### МАЛДОВА. У ПРЫДНЯСТРОЎІ БУДЗЕ РАСІЙСКІ СЦЯГ

Шэраг грамадскіх арганізацый Прыднястроўя і фракцыя «Абнаўленне» ў Вярхоўным Савеце прапанавалі змяніць дзяржаўную сімволіку Прыднястроўскай Малдаўскай Рэспублікі (ПМР). Плануецца зрабіць сцягам непрызнанай дзяржавы расійскі трыкалор. Матывацыя такой ініцыятывы вельмі дзіўная: расійскі сцяг павінен стаць афіцыйнай сімволікай ПМР, паколькі Расія «забяспечыла мір на берагах Днястра». Акрамя таго, аўтары праекту нагадваюць, што на рэферэндуме 2006 года 97 працэнтаў жыхароў краю падтрымалі незалежнасць ПМР і паступовае ўваходжанне рэспублікі ў склад Расіі. Камітэт па геральдыцы Прыднястроўскага парламенту тым часам прапанаваў свой варыянт: размясціць на расійскім трыкалоры які-небудзь адметны знак ПМР.

**Па матэрыялах газеты «Новый регион» (Расія)**

### ГЕРМАНІЯ. КАНЕЦ СПАДЧЫНЫ ШРОДЭРА

Партыя нямецкіх сацыял-дэмакратаў (SPD) робіць усё, каб пазбавіцца іміджу, які прыліп да яе ў часы кіравання Герхарда Шродэра. Гэта Шродэр ініцыяваў ліберальныя папраўкі ў сацыяльнае заканадаўства, якія атрымалі назву «Павестка дня 2010». Сёння, у часы крызісу, эсдэкі пра тую павестку намагаюцца не згадваць. Наадварот, разам з прафсаюзамі напярэдадні выбараў у Еўрапарламент SPD распрацавала і прапанавала праграму «За сацыяльную Еўропу». Аўтары выступаюць за рост заробкаў, і нават за абмежаванне рынку. Гледзячы на гэту ідыілію, журналісты згадваюць, што толькі два гады таму прафсаюзы называлі сацыял-дэмакратаў «партыяй супраць пенсіянераў», а радыкальная фракцыя прафсаюзнікаў увогуле перабегла ў стан Партыі левых.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### КАЗАХСТАН. УСЕ НА БАРАЦЬБУ З БЛОГАМ



Рахат Аліеў, кроўны праціўнік казахскага прэзідэнта Нурсултана Назарбаева, яго былы зяць, які цяпер хаваецца ў Вене, арыгінальна пракаментаваў новы казахскі закон пра СМІ. Ніжняя палата парламента Казахстана ўхваліла ў першым чытанні законапраект, які дазваляе пракуратуры разглядаць блогі і нават інтэрнэт-форумы як сродкі СМІ. Адпаведна, іх аўтары падлягаюць адміністратыўнай і нават крымінальнай адказнасці. Пакуль журналісты і блогеры пратэстуюць, ужо згаданы Рахат Аліеў адзначае, што ўлады, калі прымалі закон, хацелі аднаго: напужаць блогераў, каб тыя не перадрукоўвалі яго матэрыялы. «Улада больш за ўсё на свеце баіцца, што блогеры будуць перадрукоўваць маю кнігу «Хрышчоны цесць», — піша на сваёй старонцы ў ЖЖ Аліеў. Ён таксама прагназуе, што хутка інтэрнэт забароняць цалкам. Застаецца дадаць, што чытаць блог Аліева ў Казахстане ўсё роўна немагчыма: ён даўно заблакаваны спецслужбамі.

**Па матэрыялах казахскай прэсы і блогу Рахата Аліева**

### РАСІЯ. РУСКІЯ НЕ ЖАДАЮЦЬ ВЯРТАЦЦА Ў ЧАЧНЮ

Добрая ідэя расійскіх уладаў кампенсаваць грамадзянам РФ, які згубілі падчас вайны ў Чачні маёмасць і жыллё, прадэманстравала ўсю хлусню афіцыйных медыя наконт таго, што канфлікт у краі скончаны. 3 7 тысяч асобаў, якія звярнуліся з просьбай пра кампенсацыю, практычна няма ніводнага этнічнага рускага. Між тым, да вайны іх тут жыло некалькі сот тысяч. Фактычна ўсе яны былі вымушаны пакінуць радзіму. І вяртацца яны не збіраюцца. Усяго пасля вайны ў Чачню вярнулася толькі 200 этнічных рускіх. Руская традыцыйна займалі ў Чачні пасады тэхнічных спецыялістаў, дактароў і педагогаў. Сёння менавіта ў гэтых галінах назіраецца жудасны дэфіцыт кадраў. Па афіцыйных дадзеных, рэспубліцы патрэбны 2000 урачоў і 500 настаўнікаў.

**Па матэрыялах «Независимой газеты» (Расія)**

СПРЭЧКІ

# СПРАВА ГЕТМАНА МАЗЕПЫ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Напярэдадні трохсотай гадавіны палтаўскай бітвы на Украіне зноў пачалася дыскусія вакол магчымага зняцця анафемы з гетмана Івана Мазепы.**



Самае парадаксальнае, што палеміку пачала ўкраінская Праваслаўная Царква Маскоўскага Патрыярхату. Архімандрыт Кірыла з аддзелу царкоўных стасункаў УПЦ (МП) нечакана заявіў, што «зняць анафему з гетмана Мазепы ў тэорыі магчыма». Ён нагадаў, што ў гісторыі былі выпадкі, калі анафемы скасоўваліся. Напрыклад, анафема была знятая са стараабрадцаў у 1927 годзе.

Навіна выклікала пратэсты сярод апаратчыкаў той жа УПЦ. Айцец Андрэй з багаслоўскай камісіі Маскоўскага Патрыярху заявіў, што аргументы айца Кірылы «не вытрымліваюць крытыкі». Рэабілітацыя стараабрадцаў была магчымай, паколькі тая анафема была накладзеная не на канкрэтных лідэраў руху раскольнікаў, а хутчэй на іх царкоўныя рытуалы. Святар таксама дадаў, што анафема можа быць знятая толькі ў тым выпадку, калі асоба, на якую яна накладзеная, зробіць пакаянне за свае грахі. Увогуле, сцвярджае айцец Андрэй, анафему лепш не здымаць, паколькі рэабілітацыя Мазепы будзе аўтаматычна значыць, што царква можа дапускаць памылкі.

Гэта ўжо не першая спроба пераглядзець складаную і супярэчлівую справу Мазепы.

Анафема на гетмана Мазепу была накладзеная 12 лістапада 1708 года пасля таго, як ён перайшоў на бок шведаў. Гістарычная падзея царкоўнага пакарання мела месца ў Троіцкім саборы горада Глухаў у прысутнасці Пятра Першага і мітрапаліта Кіеўскага «за крестопреступление и за измену великому государю». Пасля малебна на плошчы гораду над чучалам Мазепы зрабілі сімвалічнае пакаранне: сарвалі з яго мундзір, медалі і пацягнулі па вуліцах.

Грэчаскае слова «анафема» значыць выгнанне з грамады, праклёнцтва. Анафема — гэта вялікае адлучэнне ад царквы (ёсць яшчэ і часовыя адлучэнні). Акрамя таго, анафема бывае розная: адлучэнне ад тайнаў, аднак з правам маліцца і мець кантакты з вернікамі; пазбаўлення святых тайн, права падтрымліваць кантакты з вернікамі; поўнае выгнанне з супольнасці хрысціян. Менавіта анафема трэцяй катэгорыі была накладзеная на гетмана.

Трэба прызнаць, што Мазепа апынуўся ў цікавай кампаніі. Першым, хто трапіў пад анафему, былі арыяне. За стагоддзі існавання практыкі да іх дадаліся прыхільнікі іншых ерэтычных сектаў, навукоўцы (Джардана Бруна), палітыкі, славутыя бунтаўнікі (Разін, Пугачоў), пісьменнікі (Леў Талстой), пратэстанты (Лютэр, Гус) і нават самі хрысціянскія лідэры (у 1054 годзе легат Папы і Патрыярх Канстанцінопаля ўзаемна наклалі адзін на аднаго анафемы, што і сталася пралогам вялікага расколу ў хрысціянстве). Самая незвычайная гісторыя адбылася з князем Дзмітрыем Данскім. У XIV стагоддзі на яго наклалі анафему, а ў 1988-м — зрабілі святым.

У праваслаўі ёсць штогадовая працэдура зачытвання спісу анафем. Праўда, у 1801 годзе з 12 асобаў, якія знаходзіліся ў спісе, пакінулі толькі Грышку Атрэп'ева і Івана Мазепу. У 1869 годзе іх прозвішчы замянілі тэрмінам «тыя, хто паўстаў на бунт і здраду праваслаўным гасударам».

Нягледзячы на такі, здавалася б, кампрамісны паварот спраў, на Украіне заўсёды патрабавалі поўнай рэабілітацыі Мазепы, які стаў сімвалам імкнення ўкраінцаў да незалежнасці (у дамове з Мазепам шведскі кароль абяцаў яму незалежнасць Украіны). Сама стаўка на Маскву, як паказала гісторыя, была памылкай: Пётр Першы і яго пераемнікі ліквідавалі гетманскую аўтаномію.

Сітуацыя з Мазепам была яшчэ больш складанай з-за таго, што Пётр Першы моцна абмежаваў правы царквы. У сваю чаргу, Мазепа быў вялікімі прыхільнікам праваслаўя і за час сваёй кадэнцыі паспеў пабудаваць вялікую колькасць праваслаўных храмаў, уключаючы славуты Міхайлаўскі сабор у Кіеве. Шматлікія царкоўнікі на Украіне тайна сімпатызавалі Мазепу, і нават у 1918 годзе па сваёй ініцыятыве арганізавалі ў Кіеве паніхіду па гетману.

Саветы, аднак, не рашыліся пераглядзець месца Мазепы ў гісторыі. Падчас святкавання 250-годдзя Палтаўскай бітвы ў 1959-м дамінавала версія пра здрадніка. Хаця ў тым жа годзе Сабор Епіскапаў Украінскай Грэка-Праваслаўнай Царквы ў Канадзе зняў анафему з Мазепы. Пазней да гэтага рашэння далучыліся УПЦ (Кіеўскі патрыярхат), праваслаўная ўкраінская царква Канады. Яны штогод служаць малебны за супакой душы гетмана.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Украіны пра Мазепу зноў загаварылі. Сам яго чын у 1709 годзе афіцыйна называецца зараз Паўстанне за незалежнасць Украіны. Яго прозвішчам назвалі вуліцы. Выява гетмана ёсць на грашовых знаках. Пра папулярнасць Мазепы сведчыць той факт, што нядаўна кіеўская адміністрацыя апраўдвала тое, што не дабудавала нейкую станцыю метро, тым, што ўсе грошы быццам пайшлі на помнік гетману.

Падчас аднаго з візітаў у Маскву Віктар Юшчанка абмяркоўваў з кіраўніцтвам РПЦ магчымасць зняцця анафемы. У 2007 годзе пры УПЦ (МП) была створаная камісія па справе Мазепы. Аднак ніякіх публічных заяў яна пакуль не зрабіла.

Але адмаўчацца будзе цяжка. Як паказвае гісторыя, заўсёды напярэдадні юбілею Палтаўскай бітвы вакол фігуры Мазепы завязваюцца гарачыя дыскусіі і спрэчкі.

Нагадаем галоўныя аргументы прадстаўнікоў абодвух бакоў. Аргументы за тое, каб пакінуць анафему: Мазепа парушыў клятву, дадзеную цару, прысягнуў не праваслаўнаму каралю, зрабіў спробу змовы супраць улады, дапусціў ва Украіну шведаў, якія разбуралі праваслаўныя храмы. Аргументы тых, хто заклікае зняць анафему: анафема была зробленая па палітычных матывах, без саборнага рашэння і па прамому загаду Пятра Першага.

КУЛЬТ АСОБЫ

# МАНУМЕНТ НАЗАРБАЕВУ

Алег НОВІКАЎ

**Цікавую рэакцыю выклікала ў казахскім грамадстве рашэнне сталічнага Саюза будаўнікоў Казахстана ўнесці карэктывы ў выгляд манумента «Казак Елі» (Казахская зямля). Ён павінен быць дапоўнены новымі дэталямі, у тым ліку барэльефам «Адзінства», у цэнтры якога скульптары плануюць паставіць фігуру цяперашняга прэзідэнта краіны Нурсултана Назарбаева.**

Помнік «Казахская зямля» быў адчынены на дзесяцігоддзе пераносу сталіцы з Алма-Аты ў Астану. Ён уяўляе сабой калону вышынёй 91 метр з фігурай міфічнай птушкі Самрук на вяршыні.

Ідэю новага барэль'ефа ўжо ўхваліў масліхат (гарадская ўлада) Астаны. Увогуле, новых барэльефаў плануецца чатыры: «Мужнасць», «Стварэнне», «Будучыня» і скульптурная кампазіцыя «Адзінства». На першых двух, адпаведна, будуць выявы казахскіх вояроў з часоў легендарных батыраў і стваральнікаў-будаўнікоў, сталявараў, нафтавікоў. У цэнтры кампазіцыі «Будучае», натуральна, — казахскія дзеці і юнацтва.

Канцэпцыя барэльефа «Адзінства» наступная: у цэнтры фігура Назарбаева, які, паклаўшы руку на канстытуцыю, прымае прысягу. За ім — маса фігур, што сімвалізуюць казахскую нацыю. Над усёй групай лятаюць ластаўкі — сімвалы міру, згоды і сяброўства (так тлумачаць аўтары праекту).

Сакратар масліхата Уладзімір Рэдкакашын на спецыяльнай прэс-канферэнцыі заклікаў не ўспрымаць ідэю айцоў горада як праяву культу асобы Назарбаева.

«Я б хацеў падкрэсліць, што мы ставім помнік не нейкай асобнай персоне, — заявіў ён. — Тыя барэльефы, пра якія ідзе гаворка, у поўнай ступені адлюстроўваюць ідэю нашай дзяржавы. Помнік ставіцца ўсяму народу, ягонаму адзінству, ягоным планам на будучыню і яго развіццю. Гэта я б хацеў найперш падкрэсліць. У агульным плане манумент толькі выйграе. Вельмі сімвалічна і вельмі цудоўна, што нашы масткі прынялі падобнае рашэнне — не рабіць асобны помнік кіраўніку краіны, аднак у той жа час вызначыць яго як будаўніка дзяржавы, гаранта канстытуцыі. Цудоўна, што ў гэтай кампазіцыі будзе такі галоўны барэльеф».

Аднак без скандалу не абышлося. Прычым нездаровую цікавасць да праекту прыцягнулі не апазіцыянеры, а менавіта чыноўнікі. Зараз толькі лянівы



супрацоўнік вертыкалі не захапляецца геніяльнай ідэяй помніка.

Мырзатай Джалдасбекаў, дырэктар прэзідэнцкага цэнтра культуры, лічыць: «Мы ўсе — сведкі подзвігу мужнасці і арганізатарскіх здольнасцяў Нурсултана Абішэвіча Назарбаева як прэзідэнта. Упершыню ў гісторыі дзяржаву Рэспубліка Казахстан стварыў Нурсултан Назарбаеў. І літаральна за 18 год ператварыў яе ў моцнае эканамічнае фармаванне, якое прызнана міжнароднай супольнасцю. Манумент — гэта сімвал дзяржаўнасці, аднак я думаю, што адначасова сімвалам нашай дзяржаўнасці з'яўляецца асабіста сам прэзідэнт, наш шаноўны Нурсултан Абішэвіч Назарбаеў».

Асаблівасць Казахстана ў тым, што нават апазіцыйныя партыі не рызыкнулі аспрэчваць супярэчлівы праект манумента. Ніхто не хоча мецъ праблем з уладамі. Галоўнымі крытыкамі рэканструкцыі «Казак Елі» стала фракцыя гісторыкаў-нацыяналістаў, якія аспрэчваюць статус Назарбаева як бацькі казахскай дзяржаўнасці.

Праблема ў тым, што ў 1917–1918 гадах у Казахстане дзейнічаў нацыяналістычны ўрад Алаш-Арды, лідэрам якога быў Аліхан Букейханаў (Букейхан). І хаця Букейханаў не з'яўляўся прэзідэнтам, а Казахстан на той час заставаўся ў рамках аўтаноміі, аднак элементы казахскай дзяржаўнасці аспрэчваць цяжка. Дададзім, што ў адрозненні ад Назарбаева, які пачынаў як камуніст, а цяпер называе сябе нацыяналістам, Букейханаў быў чалавекам прынцыпаў. Ён прайшоў праз турмы і высылкі, змагаючыся за свае ідэі, і ўрэшце паплаціўся за іх жыццём у часы сталінскіх рэпрэсій.

Другая вельмі цікавая асоба, якая заслугоўвае ўвагі, — Мустафа Шакай, дэпутат дзяржаўнай думы Расіі, лідэр туркменскай аўтаноміі (спроба стварэння ў 1917 годзе адзінай дзяржавы ў Цэнтральнай Азіі), ідэолаг цюркскага руху народаў былой Расійскай Імперыі, публіцыст. У 1942 годзе немцы прапанавалі яму стварыць Туркестанскі легіён, аднак пабачыўшы, як утрымліваюць савецкіх салдат у палоне, той адмовіўся. Праз некаторы час ён памёр у берлінскім шпіталі. Не выключана, што не абышлося без дапамогі нямецкіх спецслужбаў.

Афіцыйнае стаўленне казахскіх уладаў да Букейханава і Шакая на першы погляд пазітыўнае. Яны рэабілітаваны, пра іх здымаюцца фільмы, іхнімі імёнамі названы вуліцы. Аднак пальму лідэрства ў стварэнні і будаўніцтва казахскай дзяржавы Назарбаеў не аддае.

Пры гэтым ён часам паводзіць сябе не як патрыёт, а як перакананы камуніст, які ўзяўся выконваць ролю казахскага лідэра не па сваёй волі. Назарбаеў неяк падкрэсліваў, што да 1991 года дзяржаўнасці ў казахаў не было, зрэшты, і межаў таксама. Падобныя заявы выклікалі шок у асяроддзі нацыяналістаў, паколькі гэты тэзіс фактычна паўтарыў канцэпцыю Аляксандра Салжаніцына з яго працы «Як нам адбудаваць Расію» (1990). Аўтар «Архіпелагу Гулаг» пісаў пра адсутнасць у казахаў традыцый дзяржаўнасці, і на той падставе патрабаваў передачы Расіі пяці паўночных абласцей краіны. Падобную ідэю прапагандаваў у свой час і Жырыноўскі.

Адзін з нацыяналістаў нават патрабаваў прыцягнуць Назарбаева да судовай адказнасці за адмаўленне існавання казахскай дзяржавы ў цяперашніх межах. Натуральна, пракуратура яго заяву не прыняла. Больш за тое, распачала супраць яго справу за зневагу гонару прэзідэнта, па якой ён і быў асуджаны на два гады.

Што да казахскага грамадства, то яно, калі глядзець інтэрнэт-форумы, таксама не ў захапленні ад ідэі ўсталявання помніка Назарбаеву.

Прычыны дзве. Першая — казахі баяцца, што адкрыццё манумента Назарбаеву стане пачаткам «туркменізацыі» краіны (стварэння культу асобы па мадэлі Туркменбашы). Другая — гэта сацыяльна-эканамічная сітуацыя, на фоне якой улады пачалі рэканструкцыю манументу. Казахская гаспадарка таксама стала ахвярай крызісу. І кідаць грошы ў такі час на нейкія манументы падаецца не вельмі лагічным. «Будаваць помнікі, калі масліхат у гэтым годзе скараціў колькасць месцаў у дзяржаўных дзіцячых садках да 200, а ў мінулым іх было 400?» — з абурэннем пытаецца адзін з карыстальнікаў інтэрнэту.

Праўда, далей дулі ў кішэні справа не заходзіць. Нават самыя радыкальныя выказванні на форумах не заклікаюць да канкрэтных акцый пратэсту. Так што помнік прэзідэнту ў Астане, хутчэй за ўсё, будзе, калі сам Нурсултан не захоча згуляць у дэмакрата. Аднак у гэта мала верыцца. Трэба ўзгадаць, што ў Астане ўжо працуе музей першага прэзідэнта і заснаваны ордэн «Нурсултан Назарбаеў — Першы прэзідэнт Рэспублікі Казахстан».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### КАТРЫН ГЁРЫНГ-ЭКХАРДТ

Дэпутат нямецкага парламенту ад Партыі зялёных абраная анты-папам. Анты-папам жартам немцы называюць спікера парламента евангелістаў Германіі — аб'яднання пратэстанцкіх цэркваў краіны. Аўтаматычна спікер атрымлівае пасаду старшыні Сіноду Евангелісцкіх цэркваў. Абранне Катрын на пасаду — вельмі незвычайная падзея. Па-першае, яна была грамадзянка ГДР. У маладосці за адкрытыя сімпатыі да Партыі зялёных ФРГ яе выгналі з Лейпцыгскага універсітэта. Праўда, гэта стварыла ёй імя — яе называлі «Першым зялёным ГДР». Па-другое, ніколі ў гісторыі лідэрам евангелістаў не быў сябра левай партыі. Раней пасаду займаў сябра кансерватыўнага Хрысціянскага сацыяльнага саюза. Новы старшыня заявіла, што першым яе крокам стануць шырокія дэбаты па адносіны паміж верай і гаспадарчай этыкай. Катрын вядомая ў асяроддзі пратэстантаў як ініцыятар кампаніі па працы з дзяцьмі ў бедных сем'ях.



### ДАНІЭЛЬ АРТЭГА

У дадатак да праблем, выкліканых крызісам, адміністрацыя прэзідэнта Нікарагуа ад партыі Сандыніцкі фронт нацыянальнага вызвалення вымушана займацца праблемай захавання адзінства краіны. Пра намер выйсці са складу гэтай цэнтральна-амерыканскай краіны нечакана заявілі індзейцы, жыхары рэгіёна Бераг Маскітаў. Правадыры мясцовых плямёнаў нават ужо абвясцілі пра стварэнне сваёй дзяржавы Садружнасць Нацыі Маскітыя (Communitarian Nation of the Moskitia). Заява была зробленая падчас сходу правадыроў плямёнаў. Адначасова быў абвешчаны прызыў у індзейскае войска. На гэты момант у яго шэрагі запісалася ўжо 400 чалавек. Трэба прызнаць, што лозунгі пра самастойнасць Маскітыі маюць грунт: у культурным плане Нікарагуа падзеленая на Поўдзень, дзе жывуць крэолы, і Поўнач, дзе жывуць індзейцы. У 1987-м чырванаскурыя атрымалі аўтаномію, аднак, здаецца, гэта для іх занадта мала. Застаецца дадаць, што менавіта індзейцы складалі касцяк фінансаваных ЦРУ атрадаў контрас, якія змагаліся з сандыністамі ў 1980-я гады.

### МАХМУД АХМАДЗІНЕДЖАД

Здаецца, іранскі лідэр моцна захапіўся барацьбой з сіянізмам. Пакуль ён выступаў з антысеміцкімі прамовамі на кангрэсе па барацьбе з расізмам у Жэневе, у яго на радзіме 3-пад кантролю выйшлі настаўнікі. Прафсаюз настаўнікаў абвясціў страйк, патрабуючы ўступлення ў сілу закона, які падвышае педагогам заробак і паляпшае ўмовы працы. Закон быў прыняты яшчэ ў 2007 годзе, аднак па іранскай канстытуцыі можа ўступіць у сілу толькі пасля падпісання прэзідэнтам. Ахмадзінеджад, які ўжо два гады цягне з падпісаннем, нарэшце атрымаў страйк. Праўда, выступленне настаўнікаў не падобна на класічны пратэст. Прафсаюзы вырашылі, што педагогі ўсё ж будуць хадзіць у школы, аднак замест праметаў пачнуць распавядаць вучням пра прычыны забастоўкі. У такім фармаце пратэстаў няма нічога дзіўнага, калі паглядзець у дадзеныя *Education International* (Інтэрнацыянал настаўніцкіх прафсаюзаў). Пасля таго, як настаўнікі правялі страйк у 2005 годзе, усё кіраўніцтва трапіла за краты. Тым не менш класавая барацьба ў Іране трывае, і нават больш за тое — яна натхніла настаўнікаў у суседнім Іраку таксама аб'яднацца ў прафсаюз і пачаць змаганне за свае правы.



▸ ТВОРЦА

# Уладзіслаў Дрэма. БЕЛАРУСКІ СЛЕД ЛІТОЎСКАГА МАСТАКА

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**З пашанай і нават пяшчотай паказваў мне напрыканцы 1992 года стары беларускі віленчук, знаўца камянёў і вулак «горада-казкі», кнігу Уладзіслава Дрэмы «Зніклая Вільня», якая адразу ж стала выдавецкім рарытэтам. Унікальны фаліянт, энцыклапедычны даведнік, альбом і канцэптуальна-мастацкае даследаванне адначасова.**


У. Дрэма. Аўтапартрэт. 1928 г.


У. Дрэма. Старая. 1932 г.

Уладзіслаў Дрэма (1910–1995) вядомы не толькі ў мастацка-інтэлектуальных колах Літвы і Беларусі. Ён выдатны творца і гісторык мастацтва, аўтар сотняў артыкулаў, дзесятка фундаментальных манаграфіяў. Нарадзіўся ў Рызе, дзе здабывалі хлеб бацькі — беззямельныя сяляне.

Прагу да малявання адчуў яшчэ ў падвіленскай вёсачцы, куды ў 1914 годзе перабралася сям'я. У 1928 годзе Уладзіслаў закончыў у адзіную ў горадзе літоўскую гімназію, а ў 1931 годзе паступіў на мастацкі факультэт Віленскага ўніверсітэта, дзе быў ледзь не адзіным летувісам. Прыйшоў туды «не хлопчыкам», а нацыянальна спелай асобай, няблага прафесійна падрыхтаванай, чаму паспрыяла навучэнне ў школе Кайрукшціса.

Малады Дрэма — мастак-эксперыментатар (шукаў сябе нават у кубізме), тонкі назіральнік і псіхолаг, меў сваю тэму. Тэму жыцця горада — Вільні, з якой быў паяднаны ад 1921 года. Тэму, якая сталася для яго кропкай адліку і крытэрам мастацкіх вымярэнняў, маральных і грамадскіх дачыненняў. Сталася ўсім. У адрозненні ад сваіх беларускіх сяброў-мастакоў, якія ў адносна сталым узросце «ўкараняліся» ў жыццё буйнога поліса, ён з маленства належаў гораду.

## Дух горада

Вільня не абмяжоўвалася бернардынскімі мурамі, дзе месціўся факультэт, помнікамі культавай архітэктуры ўсіх канфесій і стыляў, цьмянымі, небрукаванымі вулкамі і пахілымі дамкамі на Папоўскай і Снегу, дзе любілі здымаць жытло студэнты. У Вільні быў шыкоўны «Ерык» (былы Георгіеўскі, у гады маладосці Дрэмы — праспект Міцкевіча, пазней Пілсудскага-Сталіна-Гітлера-Сталіна-Леніна, цяпер Гедыміна). Заліты золатам ліхтароў, падсвечаны гіпнатычным святлом кавярняў і рэстарацый, вітрынамі разнастайных крамаў і крамак, праспект Міцкевіча быў улюблёным месцам шпацыру студэнтаў, афіцэраў, дам, кавалераў і гарластых гандляроў газетамі. Пачынаўся ён ад пляца з катэдрай, густоўна ілюмінаванай «мастацкім дыктатарам» Вільні — Рушчыцам. На правы бок ад яе — адроджаны ўніверсітэт. Прэзентабельны прафесарскі корпус, бібліятэка, з-пад столі якой за зменай пакаленняў назіраюць філосафы розных часоў і народаў. Узлёт званіцы касцёла Св. Яна.

Леваруч ад катэдры, на рагу праспекта, кавярня Рудніцкіх, месца сустрэч віленскіх інтэлектуалаў. У сярэдзіне 1930-х, на тым жа баку, бліжэй да рэчкі, месцілася ўнікальная для тагачаснай Польшчы ўстанова — Інстытут досследаў Усходняй Еўропы.

У Інстытуце доследаў Усходняй Еўропы «выкладалі тое, што зараз называюць саветалогіяй, вывучалі праблемы савецкага ражыму, а таксама гісторыю і мовы: літоўскую, латышскую, эстонскую, беларускую», як сведчыў інтэлектуал-віленчук, паэт і філосаф, нобілетант Чэслаў Мілаш. «Знешнімі формамі — у выглядзе палітычных партый, студэнцкіх карпарацыяў, нацыянальных саюзаў, акцыяў пратэсту і неадэкватнымі рэакцыямі ўладаў — жыццё не заканчвалася. Прагу духоўнага быцця, апрача традыцыйна-звыклых і рэлігійных формаў, імкнуліся наталіць «закрытыя», альбо таемныя ўтварэнні («Акадэмічны клуб валацугаў», «Валацугаў-Старэйшын», «Дбайны Ліцвін» і інш.). Гуманістычна-асветніцкія традыцыі міцкевічавай Вільні не знікалі», — адзначае Мілаш.

## Гараджанін

Малады мастак ад студэнцкіх часоў жыў паўнавартасным жыццём гараджаніна. Паказваў свае творы не толькі на выставах факультэта, але і шырэй. У прыватнасці, на выставах твораў В. Кайрукшціса і яго вучняў (Коўна, 1931 і 1938 год), «Восеньскіх салонах», «Групы Віленскай» у 1937, 1939 гадах, адным з заснавальнікаў якой ён быў.

Маючы ад прыроды характар няўрымсліва-жартаўлівы, не быў ён абдзелены і грамадзянскімі пачуццямі. Прыхільны да левых ідэяў, быў сябрам Звязку незалежнай моладзі сацыялістычнай. Рабіў карыкатуры на палітычных апанентаў, што выклікала дадатковую сімпатыю ў рэвалюцыянера і паэта Максіма Танка, які быў у прыяцельскіх стасунках з мастаком. «23.01.1938 г. …збіраюся наведаць Ул. Дрэму, паглядзець яго новыя гравюры, пранізаныя глыбокай любоўю да людзей працы, да сваёй зямлі (яны — С. Г.) выдзяляюцца з усяго таго, што мне даводзілася бачыць на розных выстаўках не толькі ў Вільні… Сам ён з'яўляецца жывым звяном нашай дружбы», — зазначаў Танк.

Але не палітычная дзейнасць была дамінуючай у пошуках мастака. Фарбы і кветкі роднага краю, песні ды паданні «літоўска-беларускага памежжа» паранілі сэрца прагай творчасці яшчэ ў дзяцінстве. Шчырае імкненне ўсвядоміць месца чалавека ў сусвеце, асэнсаваць радавод свайго народа, убачыць будучыню праз культуру прыводзяць яго на пасяджэнні ў Вежу Конрада, дзе ён знаёміцца з Мілашам, супрацоўнічае з шэрагам літоўскіх і польскіх літаратурна-культурніцкіх часопісаў.

## Літоўска-беларускі арнамент

Даследчык Ян Катлоўскі ў каталозе да выставы мастака, якую ён зладзіў у Торуні ў 1999 годзе, прыводзіць досыць поўную (але не вычарпальную) бібліяграфію навуковых і папулярных работ Дрэмы. Яна ўражвае. І аб'ёмам і дыяпазонам. Ад першабытнага мастацтва (гісторыя і тэорыя) да крытычных артыкулаў і мастацтвазнаўчых партрэтаў сучаснікаў.

Але найбольш Дрэму цікавілі праблемы тэорыі мастацтва, яго вытокаў. Адна з першых яго прац, надрукаваная ў часопісе «Жагары» за 1935 год, была прысвечана літоўскаму мастацтву. Ужо ў 1938 годзе ў эксклюзіўным беларускім нумары часопіса «Пювіс» ён публікуе артыкул, прысвечаны беларускаму мастацтву. Следам за ім, у 1939 годзе, у львоўскіх «Сігналах» — артыкул «Беларускае народнае мастацтва». Гэтыя ды іншыя матэрыялы далі падставы Танку сцвярджаць, што Уладзіслаў Дрэма «не толькі лепшы знаўца літоўскага народнага мастацтва, але — і нашага, беларускага». Найбольшы ж розгалас мела публікацыя Дрэмы ў 1939 годзе ў папулярным заходнебеларускім штоквартальніку «Калоссе», які рэдагаваў Я. Шутовіч.

Зыходным пунктам развагі ў гэтым артыкуле была ідэя, што «беларускае народнае мастацтва ёсць дзіўна блізкім не да народнага мастацтва суседніх славянскіх народаў, але да народнага мастацтва літоўскага народа. Народнае мастацтва беларусаў і літоўцаў вырасла на адной аснове мастацтва перыяду неаліту і затрымала характар дэкарацыйны». Даследчык спыняецца на старасвецкай аздобе матэрыялаў, «першародных» для беларусаў — кераміцы, тканіне, вырабах з дрэва.

Сваяцтва «беларускага і літоўскага народнага мастацтва тлумачыцца хіба супольнай праз даўжэйшы час дзяржаўнасцю, стратай беларускім і літоўскім народамі ўласнай шляхты, а таксама супольным гістарычным лёсам гэтых народаў як сялянскіх». Агульным, лічыць ён, з'яўляецца і непарыўнасць народнага мастацтва абодвух этнасаў з навакольнай прыродай, з «зямлёй-карміцелькай», з сялянскім космасам, увасабленнем, «працягам і дапаўненнем прыроды» якога ёсць творчасць.

Заўважаючы этнічную розніцу ў мысленні, адчуваннях і тэмпераменце народаў, Дрэма акцэнтуе ўвагу чытача на агульным, першароднымі элеменце, якім з'яўляецца тып арнаменту ў мастацтве літоўцаў і беларусаў. Арнаменту «чыста тэхнічнага, г. зн. абумоўленага своеасаблівасцямі матэрыялу і прыладдзя да абраблення. Яго арнаментыка з лінейнымі і геаметрычнымі матывамі выражае непасрэдныя і рэчавыя адносіны да матэрыялу, тэхнікі і мастацтва. Мастацтва гэтых народаў ухіляецца ад лішняе пустое гутаркі, літаратурнасці і ўсякіх выдуманых прадметных ілюзіяў і прыродна-раслінных матываў. Фантазія гэтых народаў ёсць такая багатая, што патрабуе, не стараючыся зусім пазычыць у прыродзе, знайсці незлічоную колькасць матываў і камбінацыяў».

У 1928 годзе ў Мінску Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) выдаў том «Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва», створаны заснавальнікам беларускай мас-










Ілюстрацыі да паэмы «Рагнеда»

тацтвазнаўчай навукі дацэнтам БДУ Мікалаем Шчакаціхіным. Навуковец робіць назіранні і высновы, сугучныя тым, да якіх пазней прыйшоў Дрэма.

Дрэма мог ведаць працу Шчакаціхіна. Аднак дакладна вядома таксама і тое, што мастацтвазнаўца быў знаёмы з работамі нямецкіх даследчыкаў — П. Вебера (аўтара манаграфіі «Вільня») і А. Іппеля. Доктара Альберта Іппеля, афіцэра штаба 10-й Арміі (пры якім Ф. Рушчыц выдаў у 1916 годзе некалькі нумароў газеты), што ўвёў ва ўжытак паняцце «беларуская мастацкая школа». Доказнафакталагічную базу даследчыка Дрэма выкарыстоўваў дзеля засведчання ў беларускім народным мастацтве антычных (грэцкіх) формаў і матываў. Высновы калі і не сведчаць пра поўную канцэптуальную завершанасць і бясспрэчнасць меркаванняў аўтара, то ясна вызначаюць кірунак яго думкі.

Гэтыя думкі і меркаванні былі сугучныя настроям і зразумелыя пэўнаму колу віленскіх інтэлектуальных элітаў таго часу. Артыкул, надрукаваны ў «Калоссях», варты не толькі пільнай увагі гісторыкаў мастацтва, але і ўвядзення яго ў больш шырокі грамадскі ўжытак.

## Яго «Рагнеда»

Ад верасня 1939 года цікаўнасць Дрэмы да Беларусі хаваецца ў цэню значных падзей у Еўропе, калейдаскапічна-драматычнай змены ўладаў у Вільні. З захопам саветамі Літвы, Беларускі музей стаў падпарадкоўвацца Інстытуту Летуаністыкі, а дырэктарам яго прызначаецца былы супрацоўнік Інстытута доследаў Усходняй Еўропы Мар'ян Пецюкевіч. Неўзабаве на працу туды прыходзяць даўнія прыяцелі і калегі — П. Сергіевіч і У. Дрэма.

Гэтая старонка жыцця і дзейнасці мастака, спадзяемся, будзе напісана, бо нават шаноўны паэт Т. Венцлаў у кнізе «Імёны Вільні», у біяграме, прысвечанай Дрэму, упусціў факт яго працы ў беларускім музеі.

Скрутныя часіны фашыстоўскай навалы сталіся сур'ёзным выпрабаваннем братэрства і шчырасці адносінаў да беларусаў з боку літоўскай грамады. Да гонару мастака, ён не паддаўся нямецкай прапагандзе, адпрэчыў довады нацыянал-радыкалаў, не марыў ён і пра хуткі прыход вызваліцеляў. Калі ж беларускія сябры прапанавалі яму зрабіць мастацкае аздабленне паэмы «Рагнеда» Лявона Случаніна (Л. Шпакоўскага), Дрэма згадзіўся.

Кніжачка (11х14 см), надрукаваная ў Вільні вясной 1944 года, атрымалася годнай. Прэзентабельнасцю сваёй яна была абавязана мастаку. На вокладцы ў цэнтры кампазіцыі — постаць крывіцкай княгіні Рагнеды з мячом і шчытом, з якога ва ўсе бакі свету праменіць Сонца. Апрача таго, яшчэ шэсць ілюстрацый у тэксце. Выкананы яны вельмі прыгожым пявуча-пластычным, лёгкім контурным малюнкам у рэалістычна-фігуратыўнай манеры, з дакладнай мерай стылізацыі, ашчадным скарыстаннем святлаценю, з тактоўным ужываннем дэкарацыйных раслінных матываў, выяўленых сродкамі «лінейна-рыскавымі». Уладзіслаў Дрэма спалучыў у адзінае паўночную традыцыю з паўднёва-візантыйскай.

Усе ілюстрацыі, за выключэннем першай, якая хутчэй уяўляе застаўку-пралог у форме мініяцюрнай графічнай кампазіцыі, маюць самакаштоўны характар. Літаральна адпавядаючы паэтычнаму радку, яны адначасна па змесце сюжэта ахопліваюць поўны раздзел, а то і аб'ядноўваюць некалькіх раздзелаў запар: «Князь на белым кані, у злататканым сядле…» (раздзел 5); «Разгаралася сонцам дзявочая кроў, калі моладзь вяла карагоды… Мітусілася вогнішча бурным агнём, асвятляючы Бога Ярылу… А дзяўчаты на рэчцы пускалі вянкі…» (раздзелы 10, 11, 12); «Рагвалод князь ехаў разам з сынамі…» (раздзел 17); «Белай зданню стаіць… Кліча з ворагам лютым змагацца. Падымайся, народ! Клічуць сурмы цябе, на вялікае клічуць змаганне» (раздзел 20); «Уладзімір стомлены і славай і вайной» (раздзел 34).

Цікавыя і пяшчотна выкананыя элементы архітэктурнага краявіду ў ілюстрацыях. Аўтарскія думкі падкрэсліваюцца супрацьстаўленнем чорнага і белага колераў.

Уладзіслаў Дрэма прапанаваў эстэтычнае, даступнае і разгорнутае прачытанне мастацкага твору, да якога быў падрыхтаваны сваімі папярэднімі пошукамі. Гэта быў ягоны асабісты ўнёсак у мацаванне беларускага духу. Зрабіў ён гэты крок па-чалавечы шчыра, прыгожа і прафесійна. Паэма была адзначана рэцэнзентам Г. Альгердзічам (Александровічам) у «Беларускай Газеце» за 31 мая 1944 года не толькі за яе мастацка-паэтычную вартасць ды надзённасць, але і за каштоўнасць, эстэтычнасць самога выдання.

## Музей

Увесну 1944 года, калі бомбы вызваліцеляў сыпаліся на горад, Дрэма, рызыкуючы жыццём, ратаваў калекцыю Віленскага беларускага музея. Ратаваў экспанаты і тады, калі яны месціліся ў будынку Мастацкага інстытуту на вул. Св. Ганны, куды яны былі перамешчаны з Базыльянскіх мураў, занятых пад шпіталь, і тады, калі яны перахоўваліся ад «эвакуацыі» ў Германію ў касцёле Св. Міхаіла. Крокам сумлення быў яго выступ у абарону цэльнасці калекцыі, калі лёс яе вырашаўся пад гнётам уладаў.

Дырэктар музея Янка Шутовіч, каб абмеркаваць пытанне пераезду музея ў Мінск, склікаў супольную нараду супрацоўнікаў і беларусаў-віленчукоў на 21 лістапада. Але ў прызначаны дзень ва ўстанове не з'явіўся. Нарада не адбылася. 20 лістапада Шутовіч быў арыштаваны органамі НКУС і асуджаны на 15 гадоў лагераў. Музей застаўся ў Вільні і быў расфармаваны, а непадзельная гісторыка-культурная спадчына была раскідана паміж музеямі Літоўскай ССР і Беларускай ССР.

Так была перагорнутая гэтая беларуская старонка літоўскага мастака, галоўнага захавальніка калекцыі Беларускага музея, Уладзіслава Дрэмы.

ТВОРЧАСЦЬ

# ЛІТАРАТУРА НА КОНКУРСНАЙ АСНОВЕ

Алесь ГІНЗБУРГ

**«Карлас Шэрман — уругваец, які размаўляў па-беларуску з сакавітым лацінаамерыканскім акцэнтам...» — так кажуць тыя, хто яго добра ведаў. Сёлета споўнілася 10 год са дня смерці таленавітага паэта, перакладчыка-іберыста, эсэіста, першага старшыні ГА «Беларускі ПЭН-цэнтр». Каб аддаць даніну павагі выбітнаму дзеячу беларускай культуры, традыцыйны, пяты па ліку конкурс маладых літаратараў, які з 2001 года ладзіцца гэтай шаноўнай арганізацыяй, быў названы ў ягоны гонар. З 30 красавіка па 3 мая пры падтрымцы газет «Новы час» і «Наша ніва», а таксама кампаніі «Будзьма!» у Мінску і яго ваколіцах адбыліся «святочныя семінары» для фіналістаў конкурсу маладых літаратараў імя Карласа Шэрмана.**



«Віталь Рыжкоў — пераможца слэму «Бітва паэтаў», фіналіст конкурса Шэрмана»

Усяго на конкурс было даслана каля 80 работ з розных куткоў Беларусі і нават з па-за яе межаў. З іх журы ў складзе літаратараў, перакладчыкаў ды рэдактараў (Валянцін Акудовіч, Лявон Баршчэўскі, Марыя Мартысевіч, Барыс Пятровіч ды Андрэй Хадановіч) абрала 20 фіналістаў: 10 творцаў ва ўзросце да 28 год перамагло ў намінацыі «Паэзія» і 10 — у намінацыі «Мастацкі пераклад». Апошняя намінацыя — навінка сезону. І ў ранейшых чатырох конкурсах нікому не забаранялася дасылаць свае пераклады на суд журы, але ніколі яшчэ маладым перакладчыкам не надавалі ўвагі асобна. Больш за тое, падчас абвяшчэння ўмоваў было названае імя яшчэ аднаго патрона сёлетніх конкурсантаў: Эдгар Алан По — у свеце адзначаецца 200-годдзе з дня яго нараджэння. Творчую моладзь заахвочвалі да перакладу вершаў і прозы слупа амерыканскай літаратуры. Аўтары такіх перакладаў, незалежна ад таго, прайшлі яны ў фінал ці не, маюць шанец спрычыніцца да выдання беларускага збору твораў Эдгара По, які пабачыць свет сёлета.

«ПЭНаўскія конкурсы» вядомыя зусім не каштоўнымі прызамі, якія звальваюцца на пераможцаў. Галоўны прывілей для фіналіста — рэальны шанец на некалькі дзён фактычна з вуліцы ўвайсці ў літаратурны працэс. Агледзецца і вырашыць, ці правільны выбар ён збіраецца зрабіць у жыцці, ці заставацца яму з літаратурай. Першы крок літаратурнай ініцыяцыі для фіналіста — удзел у майстар-класах. Аўтарытэтныя літаратары абмяркоўваюць іх творы, ладзяцца цікавыя паездкі, сустрэчы з айчыннымі зоркамі літаратуры, рэдактарамі часопісаў ды выдаўцамі, варштаты, на якіх ім прапануюць выканаць розныя творчыя заданні. Завяршэнне майстар-класаў — гала-канцэрт пераможцаў, які стаецца для многіх з іх першым «выхадам у свет». Праз некаторы час даходзіць да выдання калектыўнага зборніка твораў і яго прэзентацыяў у розных гарадах Беларусі. За мінулыя гады пабачылі свет 4 зборнікі: «12+1» (конкурс імя Наталлі Арсенневай), «Формула кахання» (конкурс імя Франчэска Петраркі), «Групавы партрэт з бабай Бронай» (конкурс імені Уладзіміра Караткевіча), «In Vilnia veritas» (конкурс, прысвечаны 100-годдзю газеты «Наша ніва»).

Частка майстар-класаў мела характар маёўкі, пленэру і адбылася ў аздараўляльна-адукацыйным цэнтры ГА «Беларускі зялёны крыж» пад Смалявічамі. Па словах арганізатараў, адарванасць ад сталічнай мітусні насіла канцэптуальны характар. Ім важна было стварыць атмасферу адарванасці ад свету, містыкі і загадкавасці ў духу По.

Апроч перакладчыцкіх майстэрняў для адных і літаратурных абмеркаванняў для іншых, праграма майстар-класаў прапаноўвала маладым літаратарам і такія цікавосткі, як «круглы стол» з незалежнымі выдаўцамі (Аляксандра Дынько прадстаўляла выдавецтва «Логвінаў», а Міхась Башура — выдавецтва «Галіяфы»), сустрэча з перакладчыкам Васілём Сёмухам і прэзентацыя ажно трох свежавыдадзеных кніжак у яго перакладзе — «Фердыдурка» В. Гамбровіча, «Курдупель Цахес» Э.Т.А. Гофмана і «Юстыцыя» Ф. Дзюрэнмата, сустрэча з маладымі перакладчыкамі Паўлам Касцюкевічам (пераклаў раман «Бойня №5» К. Вонегута) і Сержам Мядзведзевым (пераклаў раман «Байцоўскі клуб» Ч. Паланюка»), прэзентацыя кніжнай серыі «Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў» — выступалі паэты Анатоль Івашчанка, Усевалад Сцебурака і Галіна Дубянецкая і шэф «Дзеяслова» пісьменнік Барыс Пятровіч. Першы дзень майстар-класаў прайшоў пад знакам слэму «Бітва паэтаў» (канкурсант Віталь Рыжкоў стаў яго пераможцам!). З мая як лагічнае завяршэнне праграмы мелі месца калектыўныя чытанні і ўзнагароджанне фіналістаў у музеі М. Багдановіча.

Сёлетні конкурс маладых літаратараў прадэманстраваў магчымасць арганічнага суіснавання рускамоўнай і беларускамоўнай літаратуры ў Беларусі. Адразу дзве яскравыя паэткі — Кацярына Зыкава і дэбютантка Іна Заікіна — і «эсэіст» (насамрэч іранічны празаік) Павел Анціпаў перамаглі з творамі на рускай мове. Зыкава і Анціпаў у дадатак прэзентавалі на конкурсе свае пераклады на рускую мову вершаў беларускіх паэтаў — Веры Бурлак і Віктара Жыбуля адпаведна.

Сярод беларускамоўных творцаў самым грунтоўным тэкстам, пададзеным на суд журы, стаў пераклад дзіцячай аповесці польскага пісьменніка Яна Бжэхвы, бліскуча выкананы Аленай Пятровіч, самым стылёвым уздзелам — паэзія Уладзя Лянкевіча і выкананыя ім пераклады вершаў Гіёма Апалінэра. Алена Талапіла пераклала апавяданне Генрыха Бёля, Наталля Давыдоўская — Германа Гесэ, але на вечарыне перакладчыца чытала іншыя пераклады — рускамоўнага беларускага празаіка Кірыла Дубоўскага. Юлія Шэдзько прайшла ў фінал з перакладамі вершаў Хорхе Луіса Борхеса, а Ганна Янкута — з перакладамі нідэрландскіх паэтаў. Прадстаўленая як адна з самых перспектыўных маладых перакладчыкаў у Беларусі, яна выступіла з эпіграфам да ўрачыстага вечара, прачытаўшы складаны для перастварэння «Звон» Эдгара Алана По.

Для сталічных студэнтак, паэтак Алены Карп і Аляксандры Сайко ўдзел у конкурсе стаў дэбютам, а віцебская паэтка Ірына Барысевіч перамагла ўжо ў другі раз. Нельга назваць навічком і Ірыну Бельскую з Наваполацку, уладальніцу мінулагодняга «Залатога апострафа». Самым прадстаўнічым выявіўся магілёўскі рэгіён — тут варта назваць паэтку Алесю Башарымаву, згаданую ўжо Іну Заікіну, «хэдлайнера» пераможнай вечарыны Віталя Рыжкова і пісьменніцу, якая піша пад псеўданімам Анка Упала.

«Я даслала пераклад, бо не знайшла ва ўмовах намінацыі «проза», — гэтак патлумачыла Анка з'яўленне самага моцнага, на нашу думку, твора конкурсу — перакладу апавядання «Скура» англійскага пісьменніка нарвежскага паходжання Руала Дала. Менавіта гэта праца была адзначаная спецыяльным прызам рэдакцыі «НЧ». «Хаім Суцін, герой апавядання, што вы пераклалі, паядноўвае сабой Беларусь і Францыю, гэтак жа, як справа мастацкага перакладу паядноўвае старыя часы і новыя часы», — адзначыў шэф-рэдактар «НЧ» Аляксей Кароль, калі ўручаў узнагароду.

Творы пераможцаў конкурсу імя Карласа Шэрмана будуць рэгулярна друкавацца ў штомесячным дадатку да «НЧ» «Літаратурная Беларусь». І цудоўнае апавяданне «Скура» стане першай майскай ластаўкай.

▸ КОНКУРС

# ПРЫЗЫ ЗА «ВОЛЬНАЕ СЛОВА»




Лаўрэаты прэміі «Вольнае слова»

Генадзь КЕСНЕР

**4 мая ў сядзібе БАЖ прайшло ўрачыстае ўручэнне прэміяў «Вольнае слова», а таксама ўганараванне дыпломамі і памятнымі падарункамі лаўрэатаў кампаніі «Журналісты за гістарычную спадчыну».**

Конкурс «Вольнае слова» ладзіўся другі год запар. Яго мэта — удасканаленне прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў незалежных СМІ і інтэрнэт-выданняў, заахвочванне таленавітых журналістаў, стымуляванне іх дзейнасці ў адстойванні агульначалавечых каштоўнасцей, у тым ліку прынцыпаў прафесійнай журналістыкі і свабоды слова.

Лепшым сярод інфармацыйных названы тэкст «Эльжбета Радзівіл, дачка апошняга гаспадара Нясвіжскага замка: «Я жыла ў тым крыле замка, якое зраўнялі з зямлёй» Глеба Лабадзенкі, які на той час працаваў у «*Комсомольскай правде» в Белоруссии*», знайшоў у Польшчы прадстаўніцу слыннага беларускага роду Радзівілаў. Журналіст здолеў «разгаварыць» спадарыню Эльжбету, якая падзялілася не толькі сваімі ўспамінамі пра аўтэнтычны Нясвіж, але і фотаздымкамі, якія даюць уяўленне пра маштабы дзейнасці стройтрэсту, які зараз рэстаўруе замак на замову ўладаў.

Другое месца журы прысудзіла серыі падарожных ілюстраваных рэпартажаў «Куба як яна ёсць». Карэспандэнтка «Еўрапейскага радыё для Беларусі» Віталіна Грахоўская падзялілася сваімі ўражаннямі ад Выспы Свабоды.

Трэцяе месца належыць рэпарцёру баранавіцкай газеты «Intex-press» Руслану Гарбачову, які ў літаральным сэнсе не пашкадаваў сваіх ног для напісання рэпартажу «Як я даганяў алімпійскага чэмпіёна». Журналіст захацеў «пакаштаваць хлеба» алімпійцаў і выйшаў на марафонскую дыстанцыю ў 50 кіламетраў сінхронна з тымі, хто браў удзел у Алімпійскіх гульнях у Пекіне.

Лідэрам намінацыі «Найлепшая аналітычная публікацыя» стала рэцэнзія «Камедыя выраджэння» Аляксандра Фядуты на купалаўскую пастаноўку Мікалая Пінігіна «Пінская шляхта» па аднайменным творы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Другое месца заняў артыкул «Казус Абрамавай, альбо Пусты гранатамёт Кучынскага» журналіста Радыё «Свабода» Віталя Цыганкова.

Першае месца ў намінацыі «Найлепшая публікацыя літаратурна-мастацкага жанру ў журналістыцы» сябры журы аддалі нарысу «Аднагодак БНР» журналіста Сямёна Печанко з «Нашай Нівы». Другое — публікацыі Руслана Гарбачова «Мікалай Галавін — дырэктар Баранавіцкай паляўнічa-рыбалоўнай гаспадаркі». Трэцяе — нарысу «Калі гісторыя ломіць лёс» Алеся Гізуна з «Intex-press» пра трагічны лёс чалавека, які правёў 25 гадоў жыцця ў сталінскіх лагерах за беларускую дзейнасць падчас другой сусветнай вайны.

У намінацыі «Дэбют» перамаглі адразу дзве маладыя таленавітыя журналісткі. Вольга Пруднікава з «Народнай Волі» вызначылася тэкстам «Артыстам Купалаўскага тэатра няма дзе жыць». І Тамара Савіч з «Intex-press», якая ўразіла сябраў журы самаахвярнасцю. Дзяўчына дзеля рэпартажу «Выпрабавана на сабе: «Застацца ў жывых» на пражытковы мінімум», выраша пражыць месяц на 223 600 беларускіх рублёў. Эксперымент ледзь не скончыўся трагічна.

▸ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# АЛЯКСАНДР ТАМКОВІЧ НАБІРАЕ ТЭМП

Аляксей КАРОЛЬ

**6 мая адбылася прэзентацыя чарговай — семай па ліку за апошнія пяць гадоў — кнігі Аляксандра Тамковіча «*Женщины*» (другое выданне, на рускай і англійскай мовах). 23 інтэрв'ю з выбітнымі беларускімі жанчынамі. У розных сферах — літаратуры, мастацтве, палітыцы, праваабарончай дзейнасці.**

Ёсць сэнс назваць іх паймення: Святлана Алексіевіч, Вольга Іпатава, Наталля Гайда, Кася Камоцкая, Людміла Карпенка, Вера Страмкоўская, Юлія Чыгір, Галіна Сіўчык, Марына Багдановіч, Таццяна Ваніна, Ірына Грушавая, Людміла Гразнова, Ніна Даўгучыц, Антаніна Кавалёва, Іна Кулей, Людміла Пеціна, Таццяна Працька, Валянціна Свяцкая, Галіна Сямдзянава, Ніна Стужынская, Зінаіда Цімошак, Валянціна Трыгубовіч. І асобна ўзгадаць Ірыну Казуліну, якая заўчасна пакінула гэты свет крыху больш за год таму. Але яна паспела пабачыць першае выданне кнігі.

Аповеды жанчын пра сабе, пра сваё жыццё, сем'і, свае трывогі, гора і радасці. Такіх розных і такіх прыгожых. А як вынік — з мазаікі інтэрв'ю паўстае па сутнасці абагульняючы партрэт беларускай жанчыны другой паловы XX —пачатку XXI стагоддзя. Такой сучаснай, мужнай і рамантычнай, унутрана разняволенай, але ўсё яшчэ ў нечым (а дзе і шмат у чым) паланёнай мінулым і знешнімі абставінамі. Цікавая і па-свойму выразная дэталь: усе гераіні кнігі (за выключэннем Галіны Сіўчык) давалі інтэрв'ю на рускай мове, і многія з гэтай нагоды выказалі шкадаванне падчас прэзентацыі.

Майстэрства інтэрв'ю — гэта не проста майстэрства задаць пытанне, але і майстэрства разгаварыць суразмоўцу на адкрытасць, на шчырасць. Аляксандр Тамковіч гэтым талентам валодае напоўніцу, што са здзіўленнем і ўдзячнасцю адзначалі ўсе яго гераіні, што прысутнічалі на прэзентацыі (а прысутнічалі, падкрэслю, амаль усе, за адзінкавымі выключэннямі па важкіх прычынах).

«Я прачытала, — прызналася прысутная на прэзентацыі другі сакратар амбасады ЗША Караліна Саваж, — усе кнігі спадара Тамковіча. Яны таленавіта распавядаюць пра людзей і падзеі, пра якія маўчаць дзяржаўныя СМІ».

▸ КАМПАНІЯ

# ЖУРНАЛІСТЫ — ЗА ЭКАЛАГІЧНЫ ДАБРАБЫТ

Генадзь КЕСНЕР

**У Беларусі стартавала кампанія «Журналісты — за экалагічны дабрабыт», ініцыятарам якой выступіла ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў».**

Як паведаміў на спецыяльным брыфінгу адзін з каардынатараў кампаніі сябра БАЖ Андрусь Клікуноў, асноўнымі прычынамі, што пабудзілі журналістаў распачаць кампанію, з'явіліся нераспаўсюд рознабаковай інфармацыі, якая тычыцца пабудовы ў Беларусі атамнай электрастанцыі (насуперак Орхускай канвенцыі, падпісанай у тым ліку і Рэспублікай Беларусь), а таксама замоўчванне з боку дзяржавы інфармацыі пра альтэрнатыўныя крыніцы энергіі і мінімізацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Сярод мэтавых груп, на якія будзе скіравана кампанія, — грамадзяне, што жывуць у раёне магчымай пабудовы атамнай электрастанцыі (паўночны захад Беларусі, Астравецкі раён Гродзенскай вобласці); грамадзяне, якія жывуць на тэрыторыях, забруджаных радыяцыяй, а таксама грамадзяне, што спажываюць прадукцыю, выробленую на тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі ў выніку выбуху на Чарнобыльскай АЭС у красавіку 1986 года.

«Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што велізарныя забруджаныя радыенуклідамі абшары ў Гомельскай, Магілёўскай абласцях, ды і на Міншчыне выкарыстоўваюцца пад пашы, пад сады, пад плошчы для вырошчвання сельскагаспадарчай прадукцыі, і гэтая прадукцыя распаўсюджваецца па ўсёй краіне. Наша задача — звярнуць увагу журналісцкай супольнасці на гэту праблему і намацаць магчымыя шляхі выйсця з яе, — адзначыў Андрусь Клікуноў. — Як наступствы тых праблем, што мы вылучылі, гэта, па-першае, пагаршэнне стану здароўя насельніцтва, забруджванне навакольнага асяроддзя. Калі будзе пабудавана АЭС, то з'явіцца праблема радыяцыйных адкідаў, якія невядома куды падзець, залежнасць ад ядзернага паліва суседніх дзяржаваў, і ўрэшце магчымая эканамічная нерэнтабельнасць».

Сярод задач, якія ставяць арганізатары кампаніі, па словах А. Клікунова, — забеспячэнне ўмоваў для журналісцкай супольнасці дзеля беспярашкоднага атрымання і распаўсюду інфармацыі па вызначаных праблемах і магчымых шляхах іх вырашэння.

Ужо на 12 чэрвеня ў рамках кампаніі прадугледжана пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Мэтазгоднасць будаўніцтва АЭС на Беларусі» з удзелам спецыялістаў у галіне ядзернай энергетыкі (як тых, хто працуе ў дзяржаўных установах, так і незалежных), а на канец чэрвеня запланаваны прэс-тур журналістаў у беларуска-ўкраінскае памежжа каля зоны адсялення (Гомельская вобласць). Пры канцы жніўня бягучага года адбудзецца яшчэ адзін прэс-тур — у Астравецкі раён Гродзенскае вобласці, на пляцоўку будаўніцтва АЭС (падчас гэтага прэс-туру мяркуецца правесці апытанне насельніцтва па актуальных праблемах, датычных будаўніцтва атамнай электрастанцыі).

Таксама БАЖ плануе ў рамках кампаніі арганізаваць адмысловы конкурс для журналістаў на лепшае журналісцкае расследаванне («Хто есць чарнобыльскую бульбу?!»), на лепшы друкаваны і радыёрэпартаж на экалагічную тэматыку, а ў часопісе БАЖ «АБАЖУР» паўстане спецыялізаваная рубрыка. На сайце Беларускай асацыяцыі журналістаў з'явіцца інтэрнэт-старонка кампаніі: факты, кантакты, статыстыка, навіны па праблеме, навіны кампаніі, апытанне, дыскусіі, абмеркаванні, каляндар падзеяў для журналістаў.

У лістападзе адбудзецца падвядзенне вынікаў фотаконкурсу ў межах кампаніі «Журналісты — за экалагічны дабрабыт», а таксама будзе падрыхтавана тэматычная выстава з найлепшымі конкурснымі працамі. Як падкрэслілі ініцыятары кампаніі, да супрацоўніцтва запрашаюцца не толькі беларускія журналісты, але і ўсе тыя, хто неабыякавы да гэтай тэматыкі.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 8.05.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.